

ВУЧОНЫЯ КАТЫ ВЫБІРАЮЦЬ БЕЛАРУСКАЕ

12

ПАДАРОЖЖА КАРАТКЕВІЧА ПА СВЕЦЕ

13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 КАСТРЫЧНІКА 2020 г. АЎТОРАК № 199 (29313)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай ШЧОКІН, кандыдат філасофскіх навук, загадчык аддзела сацыялогіі дзяржаўнага кіравання Інстытута сацыялогіі НАН.**

*«Падмуркам любой дзяржавы з'яўляецца эфектыўная сістэма дзяржаўнага кіравання і ідэалогія. Беларусь за гады сваёй незалежнасці ўжо праходзіла некалькі этапаў аптымізацыі дзяржаўнага апарату ў кантэксце актуалізацыі паўнамоцтваў. Сёння цалкам лагічна наспела неабходнасць не проста тэхнічнага перагляду паўнамоцтваў паміж галінамі ўлады, а перш за ўсё пераразмеркавання ў бок дэбюракратызацыі, больш хуткага і якаснага прыняцця рашэнняў на ўсіх узроўнях кіраўнічай вертыкалі. Тым больш, такі механізм закладзены і ў Канстытуцыі, і ў канцэпцыі дзяржаўнай кадравай палітыкі».*

# У Алашках — яблычна



У вёсцы Малыя Алашкі Шаркаўшчынскага раёна нарадзіўся апантаны аматар-селекцыянер па вырошчванні яблыкаў, адаптаваных да мясцовых кліматычных умоў, Іван Сікора. Сёлета беларускаму «мічурыну» споўнілася б сто трыццаць пяць гадоў. У вёсцы засталася хата, доследны сад і сады вяскоўцаў, у якіх Іван Паўлавіч прышчапляў новыя гатункі яблынь і груш. Наогул, алашкаўскі навуковец вырошчваў персікі і вінаград, арэхі і суніцы, ружы і бэз. Заахвочваў сваіх аднавяскоўцаў, асабліва дзяцей. У гонар загадчыка Паўночнага апорнага пункта ад беларускай плодаагароднінай станцыі, якая месцілася ў Алашках, заслужанага агранома БССР аднаму з выведзеных ім гатункаў яблыкаў далі назву «У памяць Івана Сікоры»; створаны і працуе музей, а ў сярэдзіне жніўня праходзіць абласное свята «Яблычны фэст».

Кожную восень супрацоўнікі музея ў гібрыдна-доследным садзе, закладзеным Сікорам яшчэ ў 1950 годзе, здымаюць ураджай, каб частаваць ім гасцей ды наведвальнікаў сядзібы знанага батаніка. На здымку — дырэктар музея Наталля ПЕРХУРОВІЧ *(злева)* і жыхарка вёскі Малыя Алашкі Тамара ЛІТВІНОВІЧ, якая была знаёмая з самім Сікорам, аглядаюць і парадкуюць музейны яблычны запас.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- У Беларусі пашыраны пералік захворванняў, якія даюць права на бясплатныя лекі.
- **У Мінску 13 кастрычніка ў жылыя дамы пачне паступаць ацяпленне.**
- Электронны кірмаш вакансій для сталічнай моладзі пройдзе 15 кастрычніка.
- **Спецыялізаваная харчовая выстаўка-кірмаш «ПрадЭкспа» пройдзе ў Мінску з 10 да 13 лістапада.**
- У Беларусі ў 2021 годзе за кошт бюджэту будуць праведзены дзве тысячы цыклаў ЭКА.



ISSN 1990 - 763X

20199>

Ад сэрца

# Калі клопат натхняе жыць



У Тамары Аляксандраўны залатыя рукі.

Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

**Васіль Антонавіч прывык дабівацца свайго. Ён абавязкова хацеў, каб яго пад сваю апеку ўзяла яна, міласэрная сястра Чырвонага Крыжа Тамара БЕРАЗОЎСКАЯ. І справа была не толькі ў тым, што жанчына — мясцовая знакамітасць у гэтым невялікім горадзе. Пра яе залатыя рукі ходзяць легенды: уколы робіць небалюча, можа падняць на ногі ляжачага, своечасова заўважыць нядобрае са здароўем і акажа дапамогу, у яе падапечных з'яўляецца ўпэўненасць, што жыццё працягваецца і ўсё яшчэ будзе. Васілю Антонавічу ўжо больш за восемдзесят, і яму патрэбны былі не толькі прафесійная медыцынская дапамога, але і сацыяльныя паслугі, і догляд, і проста чалавек, які паслухае пра яго жыццё за кубачкам цёплай гарбаты.**

СТАР.5

З нагоды

# НА 25-М МЕСЦЫ Ў СВЕЦЕ ПА КАМФОРТНЫМ МАЦЯРЫНСТВЕ

## З гэтага года — дадатковыя пенсійныя гарантыі для шматдзетных маці, для бяздзетных — бясплатная спроба ЭКА

**Сёлета традыцыйны тыдзень маці праходзіць у нашай краіне з 12 па 18 кастрычніка. Само свята жанчын-маці будзе адзначацца 14 кастрычніка. А найбліжэйшыя сем дзён мусяць быць багатыя на тэматычныя мерапрыемствы ва ўсіх рэгіёнах краіны, і іх задача — умацаваць сямейныя каштоўнасці і падкрэсліць асаблівае стаўленне да галоўнага чалавека ў нашым жыцці.**

— Беларусаў павінна быць болей. І каб так было, патрэбна больш моцных сем'яў, — падкрэсліла **намеснік старшыні Беларускага саюза жанчын, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Лілія АНАНІЧ.**

Парламентарый адзначыла, што шэраг знакавых мерапрыемстваў Беларускага саюза жанчын сёлета запланаваны на Гродзеншчыне. У прыватнасці, у Жыровіцкім манастыры адбудзецца малебен за ўсіх жанчын, а пасля на яго тэрыторыі будзе высаджана алея «За Беларусь».

У нашай краіне Ордэнам Маці (а ён уручаецца за выхаванне пяці і больш дзяцей) узнагароджана ўжо больш за 11 тысяч жанчын. Сёлета яго атрымалі 682 маці, і мерапрыемствы па яго ўручэнні працягнуцца на гэтым тыдні.

СТАР. 3

З першых вуснаў

# «Да дасканалага трэба пастаянна рухацца»

## Прэзідэнт возьме на кантроль мадэрнізацыю Падатковага кодэкса

**Лічбавізацыя падатковай сістэмы і збліжэнне ў гэтай сферы з Расіяй абмяркоўваліся падчас сустрэчы Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі з міністрам па падатках і зборах Сяргеем Налівайкам.**

Па словах Прэзідэнта, падаткі — адзін з асноўных элементаў эканамічнай палітыкі, шмат зроблена для таго, каб яны былі зразумелыя ўсяму народу.

«Але я памятаю, мы дамаўляліся, што вы выдадзіце нам новую, больш дасканалую сістэму падаткаабкладання, мадэрнізуеце сённяшні Падатковы кодэкс там, дзе неабходна. Кропкава, наколькі гэта магчыма, паколькі ў нас адносна нядрэнны Падатковы кодэкс. Але нічога дасканалага не бывае і да дасканалага трэба пастаянна рухацца», — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт і дадаў, што сістэму неабходна паляпшаць.

Як прыклад — праведзеная работа па змяненнях у Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях.

«Добра праведзена работа. Мабыць, пасля апошніх падзей у нейкія артыкулы будуць уносіцца змяненні. Магчыма, гэта жыццё. Так трэба прайсціся па Падатковым кодэксе. Там, канешне, у нас будзе менш работы, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка, дадаўшы, што над гэтым будуць працаваць урад і іншыя структуры . Але пытанне кіраўнік дзяржавы будзе трымаць на кантролі.

Другая тэма сустрэчы — лічбавізацыя падатковай сістэмы і Кодэкса. Кіраўнік краіны дадаў: гэта звязана з тым, што прэм'ер Расіі прапанаваў паглядзець на падатковую сістэму іх краіны. «Яна падаецца ледзь не самай дасканалай. Вось хацелася, каб вы мне адказалі на гэта пытанне. Калі яны дзесьці прасунуліся далей, дапусцім, у адміністраванні падаткаў, нам не трэба баяцца задзейнічаць, што яны ўмеюць. Тым больш нам бясплатна гэта перадаюць — і праграмнае забеспячэнне, і іншае, каб спрасціць лічбавізацыю і падаткі зрабіць празрыстымі, каб сысканне было амаль 100 працэнтаў», — заявіў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што самі беларусы ўжо наблізіліся да гэтага, і задаў пытанне: што ў гэтым кірунку нам трэба зрабіць, што зроблена сёння і ці неабходна ўвогуле гэтым займацца.

Падатковымі службамі за студзень—жнівень сабрана 17,7 мільярда рублёў. Планавае назначэнне кансалідаванага бюджэту забяспечана на 96 працэнтаў. Недабор у 700 мільёнаў рублёў звязаны з эпідэміялагічнай абстаноўкай. «З аднаго боку, яна выклікала пагаршэнне фінансавых паказчыкаў дзейнасці прадпрыемстваў. З іншага — урадам быў прыняты шэраг рашэнняў аб падтрымцы суб'ектаў і малога прадпрымальніцтва, і буйнога бізнесу. Львіная доля гэтых фактараў паўплывала на недапаступленне даходаў», — сказаў Сяргей Налівайка.

Прэзідэнт адзначыў, што будзе зусім нядрэнна, калі ўзровень недапаступленняў не павялічыцца. «Трэба нам рабіць усё, каб крыху скараціць гэтыя недапаступленні. Але будзе няпроста, вы ж бачыце: другая хваля накрыла ўвесь свет, а наша эканоміка экспартаарыентаваная. Мы ад іх залежым», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Падводкай да асноўнай тэмы размовы стала заўвага Прэзідэнта, што ён атрымаў паведамленне, дзе прапаноўвалася перанесці з прэзідэнцкага ўзроўню рашэнні больш чым 70 пытанняў. «Паколькі ў апошні час шмат кажуць пра пераразмеркаванне паўнамоцтваў, мабыць, камусьці іх не хапае. У асноўным гэта правільна. Урад трэба дагружаць. Іншыя структуры і органы ўлады трэба дагружаць, здымаць неўласцівыя Прэзідэнту пытанні. Нядаўна я атрымаў запіску — прапануецца 71 паўнамоцтва перанесці ад Прэзідэнта на ўсе ўзроўні ўлады», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### У тэму

Па словах Сяргея Налівайкі, размова не ішла пра радыкальныя змяненні ставак, аб'яднанне падаткаў. Але ён не выключае, што нейкія плацяжы ў працэсе будуць зменены ці адменены. Плануецца, што новы Падатковы кодэкс уступіць у дзеянне ў 2022 годзе.

«Прыкладна паўгода дадзена нам на выпрацоўку падыходаў да ўдасканалення падатковага заканадаўства, Падатковага кодэкса. Асноўнымі прынцыпамі будуць прастата заканадаўства ў разуменні, выкарыстанні і справядлівасць пры пытаннях падаткаабкладання. Мы пастараемся рэалізаваць гэтыя падыходы праз лічбавізацыю сістэмы, павышэнне электроннага ўзаемадзеяння падатковых службаў з суб'ектамі гаспадарання і грамадзянамі», — сказаў міністр па падатках і зборах.

Ён дадаў, што ад расійскага вопыту не будуць адмаўляцца і раней нейкія навацыі «падглядалі» ў суседніх краін, у КНР.

«Але сляпога капіравання або пераносу аднаначна не будзе. Задача стаіць менавіта прааналізаваць і выбудаваць сістэму так, каб яна была зручная для нашай краіны, — падкрэсліў Сяргей Налівайка. — Гэта не набыццё інфармацыйнай платформы з Расійскай Федэрацыі. Больш за тое, сёння ўсе платформы Расійскай Федэрацыі распрацаваны і функцыянуюць у нашай краіне».

Сяргей Налівайка расказаў, што зараз ідзе абмеркаванне пралангацыі падатковых ільгот, уведзеных з-за пандэміі. Абмяркоўваюць тэрміны працягнення, віды дзейнасці, якія ім падлягаюць.

«Мы для сябе ставім задачу кампенсаваць страчаныя даходы, але калі будуць прыняты рашэнні працягнуць ільготныя стаўкі, то зрабіць гэта будзе вельмі цяжка», — рэзюмаваў міністр.

Добрая навіна

# ДА ЎРАЧА ПА ЭЛЕКТРОННАЙ КАРТЦЫ

## У Магілёве адкрылі «разумную» інтэграваную паліклініку для пацыентаў ад нараджэння да «залатога ўзросту»

**Пакуль аналагаў такой установе аховы здароўя ў краіне няма. Яна разлічана на абслугоўванне звыш 30 тысяч дзяцей і дарослых. Сюды са старога будынка цалкам пераехала трэцяя дарослая паліклініка, а таксама часткова другая, адзінаццатая і Магілёўская дзіцячая паліклінікі. Тут жа знаходзіцца падстанцыя хуткай медыцынскай дапамогі на чатыры брыгады. Сяміпавярховік цалкам укамплектаваны сучасным медыцынскім абсталяваннем, тут укаранёная сістэма «разумная паліклініка» — гэта значыць функцыянуе электронная база пацыента, якая дазваляе адразу прааналізаваць усё лячэнне, якое ён атрымаў. Існуе і прыбор для ўліку працоўнага часу. Разумная тэхніка скануе твар і фіксуе прыход чалавека на работу. Сам будынак светлы і прасторны, для пацыентаў прадугледжаны ліфт, створаны ўсе ўмовы для безбар'ернага асяроддзя.**

Паліклініка пачне працаваць заўтра, а напярэдадні, у дзень адкрыцця, для ўсіх ахвотных пазнаёміцца з магчымасцямі ўстановы была арганізаваная экскурсія па кабінетах. Убачанае сапраўды ўразіла.

**Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід ЗАЯЦ** падкрэсліў, што нарэшце ажыццявілася даўняя мара жыхароў горада.

— Дапамагло валявое рашэнне Прэзідэнта краіны наконт фінансавання аб'екта, — паведаміў ён. — Была аказана спонсарская дапамога прадпрыемстваў Магілёва і вобласці ў памеры 1,25 % ад выручкі. Такім чынам пабудавалі гэтую паліклініку на абслугоўванне 850 пацыентаў у змену, Асіповіцкую раённую бальніцу, раддом у Магілёве, будуем кардыяхірургічны цэнтр пры Магілёўскай абласной бальніцы. У гэту паліклініку і ў мадэрнізацыю рэалізаваных аб'ектаў укладзена 53 мільёны рублёў. Летась 27 мільёнаў пайшло на набыццё тэхнікі для медустаноў. Усяго за паўтара года больш чым 100 мільёнаў рублёў накіравана на паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў аховы здароўя — набыццё новых аўтамабіляў, рэнтген-апаратаў і гэтак далей. За гэты час мы набылі 61 аўтамабіль хуткай дапамогі.



Фота Галіны ГАЎРЫЛОВІЧ.

— Паліклініка з'яўляецца яркім увасабленнем таго, чаго мы хочам і куды рухаемся, — канстатаваў **выконваючы абавязкі міністра аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ.** — Па-першае, пітэт пярвічнага звяна, бо тут пачынаецца і заканчваецца 80 % усіх зваротаў па медыцынскую дапамогу. У паліклініцы, якую адкрылі, працуе камандная сістэма ўрачоў агульнай практыкі, памочнікаў урача агульнай практыкі і педыятрычнай службы. Гэта інтэграваная паліклініка — ад нараджэння да «залатога ўзросту». Па-другое, магутнае забеспячэнне рознымі відамі спецыялізаванай медыцынскай дапамогі, дзённым стацыянарам, што называецца стацыянаразамяшчальнай тэхналогіяй. З прыняццем новых нарматыўных актаў, у тым ліку Закона «Аб ахове здароўя», мы лічым, што эканамічнымі стымуламі і рашэннямі шляхам бясплатнага забеспячэння медыкаментамі на ўзроўні дзённага стацыянара мы забяспечым пераход пацыентаў стацыянараў у дзённыя стацыянары паліклінічных устаноў. Па-трэцяе, інтэграванае карыстанне. Няма неабходнасці, асабліва ў буйных гарадах, забяспечваць усе паліклінікі магутнымі дыягнастычнымі або хірургічнымі комплексамі. Для гэтага трэба рабіць калектыўныя цэнтры. У гэтай паліклініцы будзе абслугоўвацца палова Магілёва і, напэўна, палова Магілёўскага раёна. Па-чацвёртае, разумная паліклініка. Змены адбыліся ад запісу пацыента на прыём да ўрача да ўвядзення тэрміналаў электронных картак — прааобраза інтэграванай медыцынскай карткі. Плануем з 1 студзеня 2023 года перайсці на адзіную інтэграваную медыцынскую прастору. І ў паліклініцы абыгрываецца адзін з элементаў інтэграванай паліклінікі. Навядванне медыцынскай установы ў любым куточку нашай краіны будзе заносіцца ў картку, якая будзе даступная як для яе ўладальніка, так і для спецыялістаў, да якіх пацыент звяртаецца.

Удзел у адкрыцці паліклінікі прыняў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА:**

— Медыцынская дапамога павінна быць даступная і высакаякасная, — адзначыў ён. — Такая медыцынская ўстанова, якую мы адкрылі сёння ў Магілёве, — паліклініка сучаснасці і будучыні, такія ў нас павінны быць паўсюль. Пачынаючы з уваходу, чалавек трапляе ў цэнтр увагі — сучаснае абсталяванне, высакакласныя спецыялісты. Усё зроблена з любоўю, разумным падыходам. Сумеснымі намаганнямі аблвыканкама, цэнтральнай улады, міністэрства аховы здароўя паліклініка створана ў кароткія тэрміны. Наогул у Магілёўскай вобласці развіццю сістэмы аховы здароўя ўдзяляецца вялікая ўвага. Летась і сёлета здадзены цэлы шэраг медыцынскіх аб'ектаў не толькі ў Магілёве, але і ў Глуску, Асіповічах, Бабруйску. Ёсць перспектыва развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы, за гэтым стаіць удасканаленне прафесіяналізму медыкаў. Сёння ў Магілёўскай вобласці выконваецца шэраг аперацый на ўзроўні рэспубліканскіх устаноў. Гэта сведчыць пра тое, што на рэгіянальным узроўні сістэма аховы здароўя не ўступае тым цэнтрам, якія працуюць сёння ў Мінску.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Эмамалі Рахмон перамог на выбарах прэзідэнта Таджыкістана



Дзеючы прэзідэнт Таджыкістана Эмамалі Рахмон, паводле папярэдніх даных, набраў больш чым 90,9 % галасоў на выбарах кіраўніка дзяржавы. Аб гэтым заявіў старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і рэферэндумах (ЦКВР) Бахтыёр Худаёрзада на брыфінгу ў Душанбэ. Рахмон атрымаў пераканаўчую перамогу на выбарах, яўка на якіх склала 85,39 %. Ён аб'яўляецца абраным прэзідэнтам краіны, заявіў кіраўнік ЦКВР. З сапернікаў Рахмона найбольшую колькасць галасоў набраў старшыня Аграрнай партыі Таджыкістана Рустам Латыфзада, за яго прагаласавала 3,03 % выбаршчыкаў.

*Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка* падчас тэлефоннай размовы з Эмамалі Рахмонам павіншаваў калегу з пераліча канаўчай перамогай на выбарах. Лідары дзвюх краін закранулі ў размове шырокі спектр тэм: развіццё двухбаковых адносін, падзеі ў рэгіёне, сітуацыю ў свеце. Што датычыцца беларуска-таджыкскага супрацоўніцтва, яго характар вызначылі як дынамічны, адзначылі ў прэс-службе беларускага лідара. Нягледзячы на крызісныя з'явы ў сусветнай эканоміцы, краінам удаецца значна нарошчваць тавараабарот. За паўгода 2020-га ў параўнанні з 2019-м ён вырас у 2,5 раза. У гэтай сувязі прэзідэнты выступілі за далейшае паглыбленне прамысловай кааперацыі, у тым ліку для выхаду на рынкі трэціх краін, і пашырэнне ўзаемных паставак прадукцыі.

### Урон ад прыродных катастроф склаў каля трох трыльёнаў долараў

Столькі страціла сусветная эканоміка за апошнія 20 гадоў, адзначаецца ў дакладзе агенцтва ААН па скарачэнні рызык глабальных катастроф. Паводле даных арганізацыі, за перыяд з 2000-га па 2019-ты адбылося 7 348 маштабных катаклізмаў, якія забралі жыцці 1,23 мільёна чалавек. У выніку катастроф сусветная эканоміка страціла 2,97 трыльёна долараў. Эксперты адзначаюць, што за папярэднія 20 гадоў было зафіксавана амаль удвая менш прыродных катастроф — 4212. Яны забралі жыцці звыш 1,19 мільёна чалавек, а сусветная эканоміка страціла 1,63 трыльёна долараў. Як адзначаецца ў дакуменце, рост прыродных катастроф у першае 20-годдзе цяперашняга стагоддзя звязаны са змяненнем клімату і экстрэмальнымі кліматычнымі ўмовамі. У прыватнасці, амаль у два разы павялічылася колькасць паводак, а таксама стала больш штармоў, перыядаў засухі, выпадкаў лясных пажараў і тэмпературных рэкордаў. Акрамя таго, стала адбывацца больш землятрусаў і цунамі, якія прывялі да самага вялікай колькасці ахвяр сярод насельніцтва планеты.

### Турэцкае судна аднавіла пошук радовішчаў ва Усходнім Міжземнамор'і



«Аруч Рэіс» выйшла ў мора для працягу геолагаразведчанай дзейнасці. Аб гэтым паведаміў тэлеканал TRT Haber. Адзначаецца, што судна «будзе працаваць на поўдзень ад вострава Кастэларыза да 22 кастрычніка. Як стала вядома, «Аруч Рэіс» будуць суправаджаць судна забеспячэння «Атаман» і буксір «Чынгісхан». Як вядома, у апошнія месяцы сітуацыя ва Усходнім Міжземнамор'і абвастрылася, у прыватнасці, у сувязі з актывізацыяй геолагаразведачнай дзейнасці Анкары ў гэтым раёне. У прыватнасці, пошукам радовішчаў вуглевадародаў займаецца якраз «Аруч Рэіс». Турцыя вядзе нафтагазавую разведку ў водах, якія Грэцыя і Кіпр лічаць сваёй выключнай эканамічнай зонай. Гэта выклікае супярэчнасці паміж Анкарой і шэрагам краін ЕС.

Даслоўна

**Генадзь КАЗАКЕВІЧ:**

# «Праваахоўнікі не сыдуць з вуліц і ў выпадку неабходнасці будуць прымяняць баявую зброю»

**Супрацоўнікі органаў унутраных спраў і ваеннаслужачыя ўнутраных войскаў не сыдуць з вуліц і ў выпадку неабходнасці будуць прымяняць спецсродкі і баявую зброю, заявіў першы намеснік міністра ўнутраных спраў — начальнік крымінальнай міліцыі Генадзь Казакевіч. Яго відэазварот размешчаны ў Telegram-канале афіцыйнага прадстаўніка МУС Вольгі Чамаданавай, паведамляе БелТА.**



Фота БелТА.

«МУС забяспечвае грамадскі парадак і грамадскую бяспеку ў краіне. Мы адзначаем паступовае згасанне пратэстнага руху як па тэрыторыях, так і па масавасці. Аднак пратэсты, якія змясціліся пераважна ў Мінск, сталі арганізаванымі і вельмі радыкальнымі. Сведчанне таму — акцыі ў сталіцы ў мінулую нядзелю. Яшчэ ўдзень і ўвечары гэта былі камяні, бутэлькі, нажы і заточкі, а ўжо да ночы — барыкады і падпаленыя пакрышкі. Нічога агульнага з грамадзянскім пратэстам гэта не мае. Мы сутыкнуліся не проста з агрэсіяй, а з групамі баевікоў, радыкалаў, анархістаў, футбольных фанатаў, спробамі паўтарыць падзеі пачатку жніўня», — адзначыў Генадзь Казакевіч.

Першы намеснік міністра падкрэсліў, што Беларусь спрабуюць увесці ў хаос 1990-х, прымусіць прайсці сумны шлях рэспублік, якія перажылі «каляровыя рэвалюцыі». «Ад імя МУС заяўляю: мы не сыдзем з вуліц і забяспечым парадак у краіне. Супрацоўнікі органаў унутраных спраў і ваеннаслужачыя ўнутраных войскаў у выпадку неабходнасці будуць прымяняць спецсродкі і баявую зброю», — дадаў Генадзь Казакевіч.

# НА 25-М МЕСЦЫ Ў СВЕЦЕ ПА КАМФОРТНЫМ МАЦЯРЫНСТВЕ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Паводле слоў **намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Валерыя КАВАЛЬКОВА**, у Беларусі створаны спрыяльныя ўмовы для мацярынства. Адна з сацыяльных гарантый, якая падтрымлівае сям'ю пры з'яўленні дзяцей — праграма сямейнага капіталу. Першая з іх рэалізоўвалася з 2015 да 2019 года. Каб ёй скарыстацца, у сям'і павінна было нарадзіцца трэцяе ці наступныя дзеці.

— Аналіз дэмаграфічнай сітуацыі за 2015—2019 гады паказаў, што ў параўнанні з папярэдняй пяцігодкай колькасць трэціх і наступных дзяцей у сем'ях вырасла на 40 %, — адзначыў Валерый Кавалькоў. — У нас павялічваецца і колькасць шматдзетных сем'яў. Сёння ў краіне іх больш за 110 тысяч (па даных перапісу 2009 года іх было 62,5 тысячы). Таму праграма падоўжана на новы пяцігадовы тэрмін — да 31 снежня 2024 года. Акрамя таго, першая праграма паказала неабходнасць пашырэння кірункаў датэрміновага выкарыстання сямейнага капіталу з улікам патрэбаў шматдзетных сем'яў — на будаўніцтва і рэканструкцыю ці набыццё жылля, адукацыю ці медыцынскія паслугі. Па стане на 1 кастрычніка гэтага года, адкрыта амаль 90 тысяч укладаў-дэпазітаў «Сямейны капітал». Пры гэтым прынята больш за 22 тысячы рашэнняў аб датэрміновым распараджэнні сродкамі. З іх 90 % — на паляпшэнне жыллёвых умоў.

Намеснік міністра падкрэсліў, што ў краіне рэалізуецца і вялікая праграма сямейных дапамог. Дарэчы, дапамога на дзіця да трох гадоў сёння вышэйшая за мінімальную заработную плату. На першае дзіця яна складае 430 рублёў, на другое і наступных — амаль 490 рублёў. Значнымі з'яўляюцца і аднаразовыя дапамогі. Для сям'і пры нараджэнні першага дзіцяці гэта 2 560 рублёў, другога і наступных — 3 585 рублёў. Дадатковыя выплаты ў нашай краіне ажыццяўляюцца пры нараджэнні двайнят і трайнят, гэта два бюджэты пражытачных мінімумаў на кожнае дзіцяці, або па 512 рублёў.

Сёння ў Беларусі дапамога выплачваецца на 463 тысячы дзяцей, а гэта значыць, што яе атрымлівае кожнае чацвёртае дзіця. За мінулы год у якасці дапамогі было выплачана 2,3 мільярда рублёў, а гэта 1,7 % ад ВУП.

А вось сем'ям з нізкім узроўнем даходаў аказваецца адрасная дапамога. У першым паўгоддзі бягучага года атрымальнікамі штомесячнай і аднаразовай дапамог сталі больш за 42 тысячы чалавек, якія выхоўваюць непаўналетніх дзяцей. Дзеці да двух гадоў атрымліваюць бясплатнае харчаванне. Такую падтрымку атрымалі 12,5 тысячы дзяцей, прычым амаль 4 тысячы атрымліваюць яе незалежна ад узроўню даходаў сям'і. Кошт харчавання, якое атрымлівае дзіця, — 110 рублёў у месяц.

Штогод шматдзетным і іншым катэгорыям сем'яў дапамагаюць з падрыхтоўкай дзетак да школы. Сёлета такую дапамогу атрымалі больш за 100 тысяч шматдзетных сем'яў. Сярэдні памер гэтай выплаты — 56 рублёў на кожнага школьніка.

Тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання, у тым ліку сацыяльнага абслугоўвання сямей і дзяцей (яны знаходзіцца ў Мінску і Гомелі) аказваюць паслугі па доглядзе за дзецьмі. Паслугамі нянькі могуць скарыстацца сем'і, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, а таксама двайнят і трайнят. Паслугі нянькі бясплатныя для сем'і з трайнятамі (гэта да 40 гадзін у тыдзень), і двайнятамі (да 20 гадзін у тыдзень), а таксама для няпоўных сем'яў і сем'яў, дзе расце дзіця-інвалід да чатырох гадоў. Гэтыя ж паслугі па сацыяльна нізкіх тарыфах (60 капеек у гадзіну) прапануюцца сем'ям, дзе выхоўваецца дзіця-інвалід ад 4 да 18 гадоў.

Валерый Кавалькоў падкрэсліў, што, нягледзячы на сусветны эканамічны крызіс, наша краіна не скарачае меры па падтрымцы сем'яў, а, наадварот, працуе над іх пашырэннем. З 1 верасня бягучага года для шматдзетных сем'яў павышаны крытэрый патрэбнасці пры прызначэнні штомесячнай сацыяльнай дапамогі са 100 да 115 % бюджэту пражытачнага мінімуму і павялічана працягласць тэрміну такой дапамогі з 6 да 12 месяцаў.

— Гэтая мера дазволіць аказаць сацыяльную падтрымку больш чым шасці тысячам шматдзетных сем'яў, — звярнуў увагу намеснік міністра. — Таксама ўведзены дадатковыя пенсійныя гарантыі для шматдзетных маці. Павялічаны з 9 да 12 гадоў перыяд догляду за дзецьмі да трох гадоў, які залічваецца ў стаж пры назначэнні пенсіі. Акрамя таго, жанчынам, якія нарадзілі чатырох і больш дзяцей і выхавалі іх да васьмігадовага ўзросту, даецца льгота па страхавым стажы, які неабходны пры назначэнні пенсіі па ўзросце. Для гэтых жанчын ён складае дзесяць гадоў. Для ўсіх астатніх — 17,5, і будзе штогод павялічвацца да 20 гадоў.

**Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Дзмітрый ЛАЗАР** адзначыў, што Беларусь займае 25-ю пазіцыю ў свеце па ўзроўні камфорту для мацярынства і ўваходзіць у 50 лепшых краін свету па вядзенні цяжарнасці і арганізацыі родаў кваліфікаванымі медыкамі. У тым ліку Беларусь належыць да 1/5 краін свету, дзе 100 % родаў праходзяць пад наглядам кваліфікаванага персаналу. Наша краіна апярэджвае па гэтым паказчыку Аўстрыю, Венгрыю, Германію, Данію, Нарвегію, ЗША і Францыю (сярэднесусветны паказчык складае 71 %).

Адзін з асноўных паказчыкаў рэпрадуктыўнага здароўя жанчын — мацярынская смяротнасць — за апошнія 20 гадоў знізіўся ў 10 разоў. Мацярынская смяротнасць з акушэрскіх прычын у Беларусі адна з самых нізкіх у свеце. Летась быў адзін такі выпадак, сёлета іх не было ўвогуле. Паказчык дзіцячай смяротнасці летась складаў 2,4 на тысячу народжаных жывымі, і тут мы апярэджваем усе краіны СНД, а таксама Данію, Літву, Польшчу, Вялікабрытанію і ЗША. У рэйтынгу краін шчаслівага дзяцінства Беларусь займае 35-е месца сярод 175 краін.

Дзмітрый Лазар паведаміў, што прымаюцца далейшыя меры па ўмацаванні сістэмы аховы мацярынства і дзяцінства. У прыватнасці, з 1 студзеня 2021 года вызначана магчымасць адной бясплатнай спробы ЭКА пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў. Муж і жонка павінны быць грамадзянамі Беларусі, узрост жонкі не павінен быць большы за 40 гадоў. Такая магчымасць даецца толькі ў дзяржаўных медустановах — РНПЦ «Маці і дзіця», Гарадскім клінічным радзільным доме № 2 г. Мінска і Гомельскім абласным медыкадыягнастычным цэнтры з кансультацыяй «Шлюб і сям'я». У будучым годзе плануецца ажыццявіць дзве тысячы спроб.

Гэтыя меры мусяць спрыяць выхаду з дэмаграфічнай ямы, у якой аказалася Беларусь. Паводле слоў **старшыні праўлення грамадскай дабрачыннай арганізацыі «Цэнтр падтрымкі сям'і і мацярынства «Матуля» Веранікі СЯРДЗЮК**, калі ва ўсе папярэднія гады ў Беларусі нараджалася ад 100 тысяч дзяцей, летась іх упершыню было менш — 87 602 дзіцяці.

**Алена КРАВЕЦ.**

Надвор'е

# ХАЛОДНЫ ПЕРАЛОМ З СЯРЭДЗІНЫ КАСТРЫЧНІКА

## У выхадныя магчымы першы мокры снег

**Эх, якія цудоўныя паўтара месяца восені мы ўжо пражылі! Надвор'е ў гэтыя дні — проста выдатнае, амаль увесь час тэмпература была на 2—6 градусаў вышэйшай за кліматычную норму. Так будзе да чацвярга, а далей уладу ў сваe рукі возьме другая палова сезону, так званая «панурая восень». А пакуль да сярэдзіны тыдня будзем радавацца паўднёваму цяплу, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У сераду мы апынёмся ва ўладзе атмасферных франтоў ад цыклона над Польшчай. Чакаецца, што будзе воблачна з праясненнямі. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вецер чакаецца заходні, паўднёва-заходні парывісты, уначы ў заходніх раёнах месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы будзе 7—13 цяпла, удзень — ад плюс 10 градусаў да 17 градусаў вышэй за нуль, па паўднёвым усходзе краіны — да 19 цяпла.

Першыя кроплі дрэннага надвор'я мы «зловім» ужо ў чацвер, калі пачне мяняцца накіраванасць паветраных патокаў. У дзённыя гадзіны паўднёвы вецер будзе пераходзіць на паўночна-заходні і стане паступаць халодная няўстойлівая паветраная маса. Вось тады і пачнецца пахаладанне. Уначы пераважна па паўночнай палове, удзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. У начныя і ранішнія гадзіны — слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—10 цяпла, удзень — ад плюс 8 да плюс 15 градусаў, у паўднёва-ўсходніх раёнах — да 17 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу халаднаватае паветра распаўсюдзіцца на ўсю Беларусь. Уначы будзе 2—8 цяпла, па паўднёвым усходзе — да плюс 10 градусаў. Удзень чакаецца ад 4 да 11 градусаў вышэй за нуль, па поўдні — на пару градусаў цяплей. Адчуванне холаду ўзмоцніць парывісты паўночна-заходні вецер. Сіноптыкі прагназуюць на выхадныя халоднае надвор'е, Уначы будзе ад нуля да плюс 2 градусаў, пры праясненнях — да мінус 2. Удзень чакаецца 4—10 цяпла. Месцамі на поўначы краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі. Гэта будзе дождж, але ў некаторых раёнах не выключаны першы ў гэтым сезоне мокры снег. Усё мяняецца. Хутка, аднак...

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Фінішныя выпрабаванні перад пускам рэактара

**Пачаліся на першым энергаблоку Беларускай атамнай электрастанцыі вывадам рэактара на мінімальна кантралюемы ўзровень магутнасці (менш за 1 % ад намінальнай). Гэта азначае, што ў актыўнай зоне рэактара пачалася кіруемая ядзерная рэакцыя, якая падтрымліваецца самастойна, паведамляе прэс-служба дзяржкарпарацыі «Расатам».**

На гэтай стадыі выпрабаванняў спецыялісты могуць бяспечна правесці шэраг вымярэнняў і праверыць фізічныя характарыстыкі актыўнай зоны рэактара на адпаведнасць патрабаванням праекта.

Будзе праведзена больш за 50 даследаванняў, якія дазволяць удакладніць атрыманыя пры разліках нейтронна-фізічныя характарыстыкі першай паліўнай загрузкі ядзернага рэактара, а таксама пацвердзіць надзейнасць функцыянавання абарон, блакіровак і ўсёй сістэмы ядзерна-фізічнага кантролю і ядзернай бяспекі рэактарнай установкі.

Вынікі выпрабаванняў перададуць упаўнаважаным органам краіны для атрымання дазволу на энергетычны пуск энергаблока, пасля чаго пачнецца паэтапны набор магутнасці.

**Ірына СІДАРОК.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі сакратарыята Палаты прадстаўнікоў выказваюць глыбокае спачуванне члену Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Адзінцовай Святлане Уладзіміраўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

Разам

# Дыялог на карысць устойлівасці

## У Магілёве абмеркавалі развіццё эканомікі і стварэнне спрыяльнага дзелавога асяроддзя

**Сваімі меркаваннямі падзяліліся кіраўнікі буйных прадпрыемстваў, прадстаўнікі бізнесу, навукі — усе тыя, хто непасрэдна працуе з нормамі заканадаўства і сутыкаецца з праблемамі ў іх прымяненні. Вельмі важна было пачуць іх заўвагі і ўзяць «на аловак». Гэта — частка работы на месцах над новай Канстытуцыяй. Спікеры звярталі ўвагу на змяненні, якія патрэбны ў заканадаўстве, у падыходах да планавання, у рэалізацыі мер дзяржавай для забеспячэння ўстойлівага развіцця.**

Перад пачаткам размовы **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан СТРАХАР** азнаёміў прысутных з вынікамі развіцця краіны за папярэднюю пяцігодку. У сусветным рэйтынгу дасягнення Мэт устойлівага развіцця Беларусь выйшла на 18 пазіцыю сярод 166 краін, інфляцыя ў адносінах да 2015 года паменшылася ў 2,5 раза, вынікам мэтанакіраванай палітыкі па лібералізацыі эканамічнай дзейнасці стала аб'ектыўнае скарачэнне адміністрацыйнай і кантрольнай нагрузкі. Наша краіна зарэкамендавала сябе надзейным партнёрам на сусветным рынку, падтрымлівае гандлёвыя адносіны больш чым з 200 дзяржавамі свету. Разам з тым дагэтуль узровень прадукцыйнасці працы ў Беларусі застаецца ніжэйшым, чым у краінах Еўрапейскага саюза, не ліквідаваны бар'еры, якія стрымліваюць прадпрымальніцкую ініцыятыўнасць, не вырашана праблема эфектыўнасці кіравання дзяржаўнымі прадпрыемствамі, нізкія тэмпы эканамічнага росту. Захоўваецца нявызначанасць у дынаміцы знешніх фактараў, што можа аказваць негатыўны ўплыў на беларускую эканоміку.

— Таму дзейнасць дзяржавы ў новым пяцігадовым перыядзе будзе накіравана на вырашэнне праблем і зніжэнне ўразлівасці эканомікі ў дачыненні да знешніх кан'юнктурных ваганняў, — падкрэсліў Руслан Страхар. — Галоўнай асаблівасцю эканамічнага развіцця краіны на 2021—2025 гады стане накіраванасць на стварэнне ўмоў для дабрабыту грамадзян краіны. Чым багацейшы народ,тым багацейшая краіна і тым больш яна прывабная для інвестараў. Пункты росту — экспарт, інвестыцыі, новыя рабочыя месцы, лічбавізацыя, эфектыўная сістэма кіравання эканомікай.

Роля кіраўніка, яго права на рызыку, падтрымка ініцыятыўнай моладзі, праблема маладзёжнага прадпрымальніцтва, рэалізацыя праектаў — на гэтыя і іншыя тэмы разважалі і выказваліся спікеры.

— Для любога прадпрыемства вельмі важныя мадэрнізацыя, новыя тэхналогіі, пашырэнне асартыменту выпускаемай прадукцыі, павышэнне прадукцыйнасці працы, — заўважыў **генеральны дырэктар ААТ»Магілёўхімвалакно» Пётр РУДНІК.** — Важна знайсці рашэнне, пры якім любое прадпрыемства атрымала б другое дыханне, выйшла на новы ўзровень і стала канкурэнтаздольнае. Першая чарга мадэрнізацыі нашага прадпрыемства прайшла, сёння мы вырабляем поліэфірнае валакно па двух тэхналогіях: старой — з параксілолу і новай — з тэрэфталевай кіслаты, якая дазваляе на тоне эканоміць каля 300 долараў. Зараз на прадпрыемстве рэалізуецца другая чарга праекта. Ёсць планы пасля завяршэння мадэрнізацыі стварыць на базе «Магілёўхімвалакна» навукова-вытворчы кластар, каб вырабляць поліэфірную прадукцыю з большай дабаўленай вартасцю. Пётр Руднік нагадаў, што неабходна прыблізіць навуку да эканомікі рэальнага сектара. Раней пры прадпрыемствах былі своеасаблівыя НДІ, якія працавалі над новымі тэхналогіямі, новай прадукцыяй. Зараз такога практычна няма, таму трэба прыцягваць універсітэцкую навуку. Можна было б прывязаць дыпломныя работы да канкрэтных распрацовак на прадпрыемствах.

— Патрэба ў зменах ёсць, — перакanana **доктар эканамічных навук, прафесар МДУ імя Куляшова, прарэктар па навуковай рабоце Наталля МАКОЎСКАЯ.** — Я эканаміст у вобласці даследавання і прасоўвання новых эканамічных ідэй у Беларусі. Перш за ўсё неабходна мяняць пазіцыю нашых паводзін. Дзяржаве трэба адпавядаць новым паводзінам спажыўца, прасоўвацца ў кірунку інфарматызацыі і фарміравання больш прагрэсіўных ІТ-рынкаў. Інакш эканоміка будзе тармазіць і мы будзем менш канкурэнтаздольныя. Тым больш крыўдна, што ў нас ёсць вялікі патэнцыял. Рабіць паспешлівыя і радыкальныя крокі не трэба. Эканоміка павінна стаць больш адкрытай для замежных партнёраў, для канкурэнтаў. Адпаведна ўзрасце наша канкурэнтаздольнасць. Трэба менш давіць на бізнес, неабходна ствараць больш празрыстыя каналы яго вядзення. Мне здаецца, гэта прывядзе нас да больш актыўнага эканамічнага развіцця і эфектыўнасці. Гэта нашы даходы, наш дабрабыт.

**Мікалай ЦЫКУНОЎ, старшыня Магілёўскай асацыяцыі прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў, дырэктар акцыянернага таварыства «Ольса»**, казаў пра ролю кіраўніка і яго права на камерцыйную рызыку:

— Маленькае прадпрыемства «Ольса» само сябе выцягнула з банкруцтва, да яго далучаны яшчэ шэсць такіх жа, як яно, па вытворчых плошчах, блізкіх да банкруцтва прадпрыемстваў. Роля дырэктара вялікая, павінна быць абарона кіраўніка ад тых рызык, якія існуюць.

**Ілья МАКАВЕЦКІ, дэкан эканамічнага факультэта Беларуска-Расійскага універсітэта,** лічыць, што для павышэння маладзёжнай прадпрымальніцкай актыўнасці павінна быць канкурэнцыя:

— З 2015 года ў нас пры ўніверсітэце працуе бясплатная стартап-школа. Штогод сумесна з аблвыканкамам мы праводзім з нашымі студэнтамі «Магілёўінвестдэй». Ёсць пляцоўка, эксперты, інвестары, але няма праектаў, у якія можна было б укласціся. Прычым такая праблема са стартапамі не толькі ў Магілёве, але ва ўсёй Беларусі. З Магілёўскай вобласці я не памятаю ніводнага ІТ-стартапа. ВНУ рыхтуюць шмат такіх спецыялістаў, але сярод іх чамусьці няма стартапераў.

**Аляксандр БАДЗЯКА, дырэктар высокатэхналагічнага прадпрыемства «Тэхналіт»,** дзе вельмі шмат маладых супрацоўнікаў, лічыць, што трэба стварыць здаровае канкурэнтнае асяроддзе:

— Мы сёння ў маштабах усёй краіны баімся зрабіць памылку. Пра якое развіццё можна казаць? Я б не стварыў на «Тэхналіце» тую школу інжынераў, калі б заганяў іх у вузкія рамкі. Задача кіраўніка — перасцерагчы работнікаў менавіта ад сур'ёзнай памылкі.

**Віктар ПАШКЕВІЧ, прарэктар БРУ,** закрануў балючую тэму ўзнаўлення навуковых кадраў для тэхнічнай ВНУ:

— Не менш як 40 % нашага персаналу павінна мець вучоныя ступені і званні. Мы тэхнічная ВНУ, тут павінны быць задзейнічаны пераважна мужчыны. Сёння з гэтым праблемы, бо ўчарашні студэнт, які падаваў надзеі, павінен быць вырваны з навуковага асяроддзя на перыяд службы ў арміі. Назад вяртаюцца не ўсе, шмат хто страчвае цікавасць. У нас з 40 магістрантаў мужчынскага полу 30 атрымалі павесткі, пра што тут можна казаць? Наспела неабходнасць пераглядзець нормы. І яшчэ, мы робім распрацоўкі, якія прапануем на рынку. Але некалькі гадоў таму пасля ўступлення ў дзеянне нова Падатковага кодэкса мы сутыкнуліся з тым, што павінны плаціць падатак на дабаўленую вартасць (ПДВ) яшчэ да таго, як атрымалі грошы. І мы вымушаны адмаўляцца ад сур'ёзных кантрактаў, дзе велічыня ПДВ значная. Я ўжо не кажу пра тое, што мы гэтых грошай яшчэ можам і не ўбачыць. Таму ёсць сапраўды вялікая патрэба ў карэкціроўцы нормаў Падатковага кодэкса, каб мы не вымывалі абаротныя сродкі.

**Андрэй ЦІМАЕЎ, дырэктар ТАА «Тэхнапарк «Горкі»,** казаў пра цяжкасці маладзёжнага прадпрымальніцтва, адсутнасць яго фінансавай падтрымкі:

— Наш тэхнапарк створаны на базе Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі і з'яўляецца эксперыментальным для моладзі. Імкнёмся яшчэ на этапе вучобы не загубіць жаданне развівацца, нешта спрабаваць. Бо у той жа час, калі былыя студэнты прыйдуць на вытворчасць, яны маглі б сваю ініцыятыўнасць праявіць. Мы гаворым пра ўніверсітэт 3.0 — навука, адукацыя і прадпрымальніцкая ініцыятыва. Каб ланцужок «навучылі, распрацавалі, камерцыялізавалі» быў на карысць нашай краіне. Сёння шмат праектаў і праграм развіваецца з выкарыстаннем грошай таго ж Еўрасаюза або Расіі. Было б карысна распрацаваць праграму грантаў для стартапаўскіх праектаў. І ініцыятыва б развівалася, і прадпрымальніцкія сілы ў сабе адчувалі.

Усе канструктыўныя прапановы, якія прагучалі падчас размовы на дыялогавай пляцоўцы, будуць сістэматызаваны Магілёўскім аблвыканкамам і перададзены на разгляд ва ўрадзе.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ГОДНЫЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ: АД МОЛАДЗІ І ДЛЯ МОЛАДЗІ



**На маладзёжным форуме ў Віцебску.**

Фота БелТА.

**Адкрыты дыялог БРСМ «Беларусь — гэта МЫ» прайшоў у Віцебску. У аднайменнай канцэртнай зале сабраліся ініцыятыўныя хлопцы і дзяўчаты з усёй вобласці, каб разам з запрошанымі экспертамі — прадстаўнікамі ўлады — абмеркаваць важныя хвалюючыя пытанні.**

Прысутныя юнакі і дзяўчаты звярнуліся да **намесніка старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзіміра ПЕНІНА** з пытаннем аб стварэнні ў горадзе Дома моладзі. Спікер, адказваючы, заўважыў, што яно ўжо ўзнімалася раней. «Цяпер трэба грунтоўна гэта абмеркаваць і зразумець, для чаго і пад што ствараць праект. Таксама важнае пытанне — фінансаванне. Але прапанова правільная, таму будзем рухацца ў гэтым нап-рамку».

**Намеснік старшыні Віцебскага гарвыканкама Віктар ГЛУШЫН** падтрымаў ідэю стварэння маладзёжнай крэатыўнай прасторы. Пасля таго як прапанова даскананала прапрацуецца спецыялістамі, гарадскія ўлады знойдуць пляцоўку. Гэта можа быць як новы будынак, так і існуючы, якому дадуць «другое дыханне».

Падчас адкрытага дыялогу закранулі пытанні важнасці выкарыстання сацыяльных сетак дзяржслужачымі, стварэння Маладзёжнага агенцтва для працоўнай моладзі, папулярызацыі дзяржаўнай сімволікі і іншыя тэмы. Ад хлопцаў і дзяўчат прагучала думка, што Міністэрства адукацыі больш арыентавана ў сваёй рабоце на школьнікаў і студэнцтва. Але сярод маладых рабочых, прадпрымальнікаў, фермераў, дзяржаўных служачых ёсць шмат здольных, таленавітых людзей, якія змаглі б сваімі крэатыўнымі ідэямі зрабіць унёсак у развіццё краіны. **Першы сакратар Чыгуначнага райкама БРСМ Карына ПУШКАРОВА** вынесла на абмеркаванне пытанне аб стварэнні агенцтва, якое аб'ядНае абсалютна ўсю моладзь.

**Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Анатоль ЛІНЕВІЧ** дадаў, што ідэя нядрэнная. Але, на яго погляд, было б правільней надзяліць БРСМ вялікімі паўнамоцтвамі, пашырыць сферу дзейнасці арганізацыі, каб яна дапамагала ў развіцці, рэалізацыі ідэй не толькі школьнай і студэнцкай моладзі. Дарэчы, такая работа ў БРСМ ужо вядзецца, варта толькі выразней расставіць патрэбныя акцэнты.

У зале, дзе праходзіў адкрыты дыялог, таксама знаходзілася скарбонка ідэй і прапаноў у Стратэгію развіцця дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі краіны да 2030 года і ініцыятыў, скіраваных на канструктыўны рух Беларусі ў будучыню. На яе быў нанесены QR-код маладзёжнай платформы «Рух НАПЕРАД», ахвотныя пакінулі ў скарбонцы свае пажаданні і ініцыятывы. Усе яны будуць разгледжаны БРСМ у найбліжэйшы час.

Аналагічнае мерапрыемства ў той жа дзень прайшло і на Міншчыне. Яно аб'яднала больш за 800 удзельнікаў: школьнікаў, студэнтаў, маладых спецыялістаў у розных сферах — навукоўцаў, журналістаў, кіраўнікоў грамадскіх арганізацый.

Падзея стартавала ў Мінску. На адкрыцці ў Цэнтральным доме афіцэраў выступіла **старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ:**

— Падобная пляцоўка — гэта магчымасць паказаць сябе, абмяняцца думкамі, абмеркаваць перспектывы развіцця сваёй сферы, раёна і краіны. Для нас, цяперашніх кіраўнікоў, вельмі каштоўнае ваша меркаванне, таму што вам ствараць будучыню нашай маладой незалежнай дзяржавы. Сёння вы ўжо ўключаны ў рэальнае жыццё. Многія з вас рэалізаваліся як педагогі, урачы, спецыялісты — працаўнікі вытворчасці, творчыя асобы. Але самае галоўнае — вы маладыя людзі з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, таму вы тут.

**Першы сакратар ЦК БРСМ Дзмітрый ВАРАНЮК** адзначыў, што моладзь у нас вельмі ініцыятыўная. «Самае галоўнае, каб вашы ініцыятывы неслі канструктыўны падыход. І выдатна, што на працягу ўсіх форумаў, і асабліва на форуме ў Мінскай вобласці, калі ў кожнай секцыі абмеркаваліся ўсе кірункі, якія датычацца развіцця нашай краіны, мы пачулі шмат самых розных ініцыятыў».

Пасля моладзь паехала па рэгіёнах. На «Барысаў-Арэне» працавала інтэрактыўная пляцоўка, там прадставілі розныя маладзёжныя распрацоўкі і інавацыйныя праекты. Сярод іх, напрыклад, праграма, якая дапаможа дзецям з асаблівасцямі развіцця падчас гульні пазнаёміцца з жывёльным светам. Таксама хлопцы і дзяўчаты пабывалі ў Барысаўскім медыцынскім каледжы, СЗАТ «БелДжы», індустрыяльным парку «Вялікі камень» і іншых значных аб'ектах рэгіёна. А яшчэ правялі адкрыты дыялог са **старшынёй Мінаблвыканкама Аляксандрам ТУРЧЫНЫМ** у Палацы культуры імя М. Горкага ў Барысаве. Абмеркавалі пытанні занятасці, сацыяльных праектаў і грантавай падтрымкі маладых людзей. Абяцалі пачуць сучаснае пакаленне і такія сустрэчы арганізоўваць часцей.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# Калі клопат натхняе жыць



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Калі дакументы былі аформлены, Васіль Антонавіч не хаваў свайго задавальнення. Задача Тамары Аляксандраўны была дапамагаць мужчыну, бо яна не звычайная медсястра, а медыцынская міласэрная сястра медыка-сацыяльнай службы Чырвонага Крыжа «Дапамога». Дарэчы, гэта ўнікальная служба, якая аказвае ў рамках адной структуры паслугі медыцынскія, сацыяльныя і індывідуальнага догляду дома. Мэта службы — дапамагчы людзям, якія маюць патрэбу ў доглядзе, не трапіць у інтэрнат для састарэлых, а застацца дома і быць там настолькі доўга, наколькі гэта магчыма, з максімальна высокім узроўнем незалежнасці і якасці жыцця.

Увогуле, першыя міласэрныя сёстры Чырвонага Крыжа пачалі працаваць на Беларусі яшчэ ў другой палове XIX стагоддзя. Працуючы ў абшчынах міласэрных сясцёр мясцовых упраўленняў Расійскага Чырвонага Крыжа ў Мінску, Віцебску, Гродне і Магілёве, яны дапамагалі ў бальніцах, клапаціліся аб цяжкахворых, працавалі ў ачагах інфекцый. У 1964 годзе ў Беларускім Чырвоным Крыжы была сфарміравана Служба міласэрнасці для забеспячэння догляду дома ветэранаў і інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны. У хуткім часе дзейнасць службы была пашырана да забеспячэння медыцынскай і сацыяльнай дапамогі адзінокіх пажылых людзей і інвалідаў.

Колькасць міласэрных сясцёр даходзіла да тысячы ставак за кошт дзяржаўнага фінансавання. Медыцынскія міласэрныя сёстры былі заўважаны на сваіх тэрыторыях і ў цэлым вырашалі патрэбы пажылога насельніцтва ў медыка-сацыяльнай дапамозе дома.

Дзяржаўнае фінансаванне службы было спынена яшчэ ў 2002 годзе ў сувязі са змяненнем заканадаўства, таму склад службы скараціўся. Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа пачало забяспечваць заробак міласэрным сёстрам за кошт членскіх узносаў, ахвяраванняў і ўнутранай спонсарскай дапамогі, а з 2013 года і праз удзел у дзяржаўным сацыяльным заказе.

Сёння ў Беларусі працуе 199 работнікаў службы — гэта 153 кваліфікаваныя медыцынскія міласэрныя сястры, малодшыя міласэрныя сёстры, а таксама псіхолагі і сацыяльныя работнікі. Тамара Аляксандраўна адзіная медсястра гэтай службы ў Старых Дарогах. Пад яе апекай адначасова знаходзяцца да шасці састарэлых людзей і тых, што маюць інваліднасць. Гэта няшмат для горада з 11-тысячным насельніцтвам.

Тамара Аляксандраўна прыходзіла і адразу бралася за справу: мерала ціск, праводзіла неабходныя хірургічныя маніпуляцыі, сачыла за катэтарам, выконвала прызначэнні дактароў, сачыла, каб падапечны прымаў прапісаныя доктарам лекі, каб у яго заўсёды была прыгатаваная ежа і ўвогуле мелася ўсё неабходнае для гаспадаркі пажылога чалавека. Як глытка свежага паветра ён чакаў прыходу сваёй любімай «сястрычкі». Калі ўсё было добра, і не прыспешвалі іншыя падапечныя, Тамара Аляксандраўна з задавальненнем прымала запрашэнне папіць разам гарбаты. Гэта быў самы любімы час Васіля Антонавіча. Ён расказваў жанчыне аб сваіх радасцях і горы, аб марах і расчараваннях. Міласэрная сястра разам з падапечным нібыта пражывала яго жыццё.

— А потым мне пазванілі раніцай і сказалі, што Антонавіч памёр, — Тамара Аляксандраўна адвяла позірк, каб я не заўважыла яе слёзы. — Я працую ў службе больш за сорак гадоў, але ніяк не магу прывыкнуць да смерці. Разумею, што мае падапечныя людзі найчасцей сталыя і адзінокія, якія нярэдка ўжо не могуць абслугоўваць сябе. Але я бачу не бездапаможных, а менавіта людзей — цікавых, добрых і няпростых, з усімі іх недахопамі і вартасцямі. Яны становяцца «сваімі», і са смерцю кожнага з іх я адчуваю, што страчваю частку «свайго». Гавораць, што пажылыя людзі забіраюць энергію. Няпраўда! Яны аддаюць яе, вучаць цаніць кожны момант свайго жыцця.



Вяртанне дабра Алене Іванаўне.

Мы некаторы час сядзім моўчкі за сталом у офісе Чырвонага Крыжа ў Старых Дарогах. Будынак стары і халодны, але ў ім зроблены сціплы касметычны рамонт. Яго зрабіў муж Тамары Аляксандраўны, бязменны валанцёр міласэрнай сястры, каб яго любая магла адчуваць сябе там як мага больш камфортна. Раніцай дома яны разам снедаюць, п'юць зялёны чай, потым мужчына адвозіць Тамару Аляксандраўну на работу. На працягу дня ён можа пад'ехаць у патрэбнае месца да жонкі, каб дапамагчы данесці прадукты яе падапечным.

Мы дапіваем каву і збіраемся выходзіць з Тамарай Аляксандраўнай. Яна спяшаецца. Тлумачыць, што людзі хвалююцца, калі яна затрымліваецца. Тэлефануе дзевяностагадовай Алене Іванаўне, каб папярэдзіць, што будзе праз 10 хвілін.

Заходзім у кватэру, у якой добра прыбрана. Алена Іванаўна чакае нас на канапе. Яна дрэнна бачыць, і ў яе баліць нага. Нядаўна ў жанчыны здарыўся гіпертанічны крыз, і адна нага моцна распухла. Жанчына тады вельмі напалохалася. Гаворыць, ледзь дапаўзла да тэлефона, каб выклікаць хуткую. Родных у яе няма, таму, акрамя ўрачоў, аб тым, што здарылася, паведаміць не было каму.

— Напэўна, Тамара Аляксандраўна — гэта вяртанне дабра, якое я некалі ў жыцці зрабіла, — гаворыць Алена Іванаўна. — Памятаю, калі яна маладзенькай пташачкай прыехала да нас у Старыя Дарогі, галоўны ўрач не хацеў браць яе — вельмі маладзенькая. Я тады як другі сакратар райкама кампартыі паклапацілася, і яе аформілі. Ну так, у Чырвоны Крыж. А што такое Чырвоны Крыж? Ніхто толкам не разумеў, навошта ён! А вось цяпер, калі стала старая і бездапаможная, то зразумела: гэта і лячэнне, і догляд, і парады, і добрыя адносіны.

Пакуль падапечная расказвае пра жыццё, Тамара Аляксандраўна шчыруе вакол Алены Іванаўны. Мерае тэмпературу, ціск, узровень цукру і кіслароду ў крыві, намазвае хворую нагу маззю, закапвае вочы...

А потым радасна абвяшчае падапечнай, што сёння ў яе ўсе паказчыкі ў норме. Жанчыны задаволены вынікам.

— Тамара ж мяне не толькі лечыць, — раптам нібыта па сакрэце гаворыць мне Алена Іванаўна. — Яна мяне навучыла і каву смачную піць, мне для ціску трэба. Я раней толькі распушчальную піла, а цяпер вось сапраўдную італьянскую з кавалкам чорнага шакаладу. Гэта ж такая асалода!

З другога пакоя пачуўся бой гадзінніка. Тамара Аляксандраўна паглядзела на тэлефон — трэба ісці. Паабяцала падапечнай вярнуцца ўвечары, і мы сышлі. Жанчына спяшалася да шасцідзесяцігадовай Таццяны Георгіеўны. Жанчына год таму злегла пасля інсульту. Муж яшчэ не пенсіянер, працуе. Дачка прыходзіць, але не ведае, як дапамагчы ляжачай маці... Жанчыне станавілася ўсё горш, пакуль у жыцці не з'явілася міласэрная сястра Чырвонага Крыжа.



Дзверы дома адчынены, гэта значыць, нас чакалі. Мы ішлі на голас Таццяны Георгіеўны па доўгім калідоры і заўважылі, як на кухні кошка корміць сваё кацяня, пяшчотна падцягваючы яго да сябе. Гэтак жа пяшчотна нас сустрэла гаспадыня дома. Жанчына ляжала на ложку ў маленькім пакойчыку і, убачыўшы нас, нібыта пацягнулася ўсім целам у наш бок. Паклікала мяне, каб расказаць, што яшчэ год таму яна ўвогуле не рухалася, ляжала як «бервяно». А цяпер вось згінае калені, варушыць нагамі, прыўзнімае спіну... Навучылася сама падымацца з дапамогай спецыяльнай вяроўкі і сядзець. Гэтыя змяненні адбыліся за год апекі над ёй Тамары Аляксандраўны. Кожны дзень тая рабіла спецыяльнае практыкаванне ЛФК з падапечнай, клапацілася аб ёй, усялала надзею.

— Я сама па прафесіі медсястра, — прызнаецца Таццяна Георгіеўна. — Ніколі не бачыла такіх людзей, як Тамара. Напішыце пра яе — яна ж анёл. Ды ўвогуле ў яе сям'я ўся такая. Яны з мужам ходзяць па горадзе ды дапамагаюць! Думала — маё жыццё пасля інсульту скончана. Але не! Цяпер веру, што буду хадзіць. Як толькі ўстану, пачну сама хадзіць па прадпрыемствах, каб людзі не забываліся пра Чырвоны Крыж, ахвяравалі. Пра гэта не думаеш, пакуль не сутыкнешся з бядой.

Жанчына старалася і нам паказаць свае дасягненні. Вось пацягнула за вяроўку, прывязаную да сцяны, і села, вось старанна сціскае палец міласэрнай сястры і абедзве задаволены, што атрымалася. Гляджу, як шчыра радуецца Тамара поспехам сваёй падапечнай, як непрыкметна папраўляе ёй коўдру, як акуратна прычэсвае валасы, каб тая на фота добра выглядала. Здаецца, што перад табой звычайныя сяброўкі, калі б не ціск, падгузнікі, масаж...

Сёння такія «сяброўкі» ёсць у 1017 чалавек, якія пражываюць у Беларусі. З іх большасць — гэта людзі, якім за 80 гадоў. Адзінокія, пажылыя ці з інваліднасцю, якія поўнасцю ці часткова страцілі здольнасць да самаабслугоўвання і перамяшчэння, з цяжкімі хранічнымі захворваннямі. Дапамогу ў год атрымліваюць прыкладна 1,5 тысячы чалавек. Усе медыцынскія міласэрныя сёстры Чырвонага Крыжа пастаянна павышаюць свой прафесійны ўзровень не толькі на курсах павышэння кваліфікацыі, але і на тэматычных трэнінгах і семінарах. Тамара Аляксандраўна лічыць, што ў медыка-сацыяльную службу Чырвонага Крыжа «Дапамога» ідуць працаваць невыпадковыя людзі. Яны нават могуць не ўсведамляць, што па прызванні не звычайныя медсёстры, а менавіта міласэрныя. Гэта адбываецца ў працэсе работы. Так здарылася і з ёй, калі стала даглядаць сваіх першых падапечных — інвалідаў вайны. Жанчыне ўдалося адразу ўбачыць у іх «сваіх» і сэрцам адчуць, што ім патрэбна, чаго чакаюць, аб чым мараць... Медыцынская міласэрная сястра — гэта лад жыцця, які нараджаецца ў глыбіні сэрца.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**



Таццяна Георгіеўна ўжо навучылася самастойна садзіцца.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | | |
|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** | |
| **Продавец** | **ОАО «БАТЭ» – управляющая компания холдинга «Автокомпоненты», г. Борисов, ул. Даумана, 95** | |
| **Предмет аукциона: недвижимое имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. Даумана, 91/1-3** | | |
| **Наименование (назначение), составные части и принадлежности** | **Инвентарный номер** | **Общая площадь** |
| **Складское помещение РСЦ** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); **Составные части и принадлежности:** складское помещение РСЦ (А1/к) | 610/С-61388 | 71,5 кв. м |
| **Венгерский склад** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); **Составные части и принадлежности:** венгерский склад (А1-2/к), проезды (а1), подпорная стена (а2), ограждение (а3) | 610/С-61387 | 1712,6 кв. м |
| **Материальный склад** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); **Составные части и принадлежности:** материальный склад (А1/к), пристройка (1) | 610/С-61390 | 521,5 кв. м |
| **Склад и растворный узел РСЦ** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); **Составные части и принадлежности:** склад и растворный узел РСЦ (А1/к) | 610/С-61389 | 198,8 кв. м |
| **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,6550 га, предоставлен Продавцу на праве аренды сроком по 20.04.2045 для обслуживания материального склада, складского помещения РСЦ, венгерского склада, склада и растворного узла РСЦ | | |
| **Начальная цена (с НДС 20 %) – 518 048,33 белорусского рубля** | | |
| Порядок ознакомления с предметом аукциона: понедельник–пятница с 9.00 до 15.00, Иванов Дмитрий Олегович (главный инженер) +375 29 657-61-84; 8 (0177) 78-84-17 | | |

| | |
|---|---|
| **Задаток 10 % от начальной цены лота** перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона |
| **Условия аукциона** | |
| Покупатель (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) обязан своими силами и за свой счет: - в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня покупки предмета аукциона или иной, письменно согласованный с Продавцом срок, установить по границе земельного участка, разделяющее территории Продавца и Покупателя ограждение территории (высота 3 метра, непрозрачное, с установкой на ограждении колючей проволоки «Егоза»; - возместить Продавцу расходы на рыночную оценку предмета аукциона в размере 600,00 (шестьсот белорусских рублей 00 копеек) | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона было опубликовано в газете «Звязда» от 20.08.2020 г. | |
| Продавец или Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **26.10.2020 в 11.00, по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **23.10.2020 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные данные** | **+375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовбытсервис» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:**

**- здание конторы** *(составные части и принадлежности: одноэтажное деревянное здание конторы с холодной пристройкой)*, **инв. № 610/С-12656, общая площадь 58 кв. м;**

**- склад № 2** *(составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание склада № 2 с сараем)*, **инв. № 610/С-12651, общая площадь 115 кв. м;**

**- гараж** *(составные части и принадлежности: одноэтажный кирпичный гараж с пристройкой)*, **инв. № 610/С-12657, общая площадь 614 кв. м (далее – Объекты).**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 640400000013000404 площадью 0,4217 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. Залинейная, 15.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **223 320,00** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены (**22 332,00** бел. руб.).

**Гараж (инв. № 610/С-12657) находится в ипотеке у ОАО «Белвнешэкономбанк», согласие банка на отчуждение имеется.**

**Задатки перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **16.11.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.11.2020** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17, 136-31-11.**

УНП 600012016

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельский ликеро-водочный завод «Радамир» (продавец) извещает о проведении 29 октября 2020 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 30 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС, бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| | **Местонахождение имущества: г. Гомель, ул. Севастопольская, 106** | | |
| 1 | **Орбитальная бракеражная (инспекционная) машина модель BR14** (инв. № 4501204), пр-во Италия, г. в. 2006 | **25 060,00** | 1 253,00 |
| 2 | **Элеватор пневматический для колпачков модель EP300** (инв. № 4501205), пр-во Италия, г. в. 2006 | **8 120,00** | 406,00 |
| 3 | **Моноблок «Розлив+Укупорка» модель MO LD 20/4 VA (инв. № 450995),** г. в. 2006, производительность – 6000 бут./час, мощность – 5,5 кВт, пр-во Италия «CIMEC» | **56 980,00** | 2 849,00 |

**Продавец:** ОАО «Гомельский ликеро-водочный завод «Радамир», г. Гомель, ул. Севастопольская, 106.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8(0232) 26-23-34, 8(033) 315-16-17 – Леховец Сергей Петрович. **Шаг аукционных торгов – 5 %.**

**Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (ОАО «Гомельский ликеро-водочный завод «Радамир»): р/с BY86 BLBB 3012 0400 0783 1600 1007 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНН 400078316, БИК BLBBBY2X, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с 13 октября 2020 г. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 27 октября 2020г. в 16.00. **Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.**

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Продавцом в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 25.08.2020 г. № 164 (29278). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by в разделе «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

## 26 октября 2020 года в 14.00 в актовом зале общества состоится внеочередное общее собрание акционеров

## ОАО «Вишневка – 2010»

**с повесткой дня:**

1. «Внесение изменений в Устав ОАО «Вишневка – 2010».

Регистрация участников общего собрания акционеров будет осуществляться 26 октября 2020 года с 13.00 до 13.45 по месту проведения собрания.

Для регистрации необходимо иметь при себе: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по месту нахождения общества (Минский район, аг. Вишневка, ул. Центральная, д. 1А) с 08.00 до 17.00 с 15 по 25 октября 2020 года.

УНП 600041880

## Извещение о проведении 26 октября 2020 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
| Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-130521 общей площадью 1862,8 кв. м (наименование: здание производственной базы; назначение: здание многофункциональное; составные части и принадлежности: трехэтажное из ж/б панелей и кирпича здание производственной базы); капитальное строение с инвентарным номером 600/С-165694 общей площадью 717,1 кв. м (наименование: склад-навес; назначение: сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: склад-навес А, площадка а1, ограждение а2, сеть электроснабжения Б, сеть водоснабжения В) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 1,2993 га, кадастровый номер – 623650100001002871 |
| Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Загородная, 1В, 1В/1 |
| Начальная цена: 1 885 851,00 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка: 188 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **26 октября 2020 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 14.10.2020 по 22.10.2020 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

## Организатор торгов: ОАО «Пинск-стройматериалы», в лице антикризисного управляющего Будкевича Н. П., тел. +375 (44) 568-06-70, объявляет о проведении 30.10.2020 года в 12.00 публичных торгов в форме аукциона по адресу: г. Пинск, ул. Пучкова, 14

Предмет торгов:

**Лот № 1**

Дебиторская задолженность в сумме – 4707,40 (четыре тысячи семьсот семь) рублей, 40 копеек. Экономическим судом Брестской области по данному платежу предоставлена отсрочка до 2026 года и рассрочка по уплате равными частями до 2033 года.

Начальная цена – 4707,40 рубля.

Сумма шага аукциона – 235,37 бел. руб.

Размер задатка – 470,74 бел. руб.

Шаг аукциона составляет 5 % от начальной стоимости предмета аукциона.

**Лот 2**

Дебиторская задолженность в сумме – 29208,55 (двадцать девять тысяч двести восемь) бел. руб. 55 копеек.

Начальная цена: 29208,55 бел. руб.

Сумма шага аукциона: 1460,43 бел. руб.

Размер задатка: 2920,85 бел. руб.

Шаг аукциона составляет 5 % от начальной стоимости предмета торгов.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375 (44) 568-06-70, Николай Петрович.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток 10 % от начальной стоимости лота, не позднее **29.10.2020** г. на р/с BY39 PJCB 3012 5200 0410 0000 0933 в ОАО «Приорбанк», код банка PJCBBY2X, УНП 200250973, получатель – ОАО «Пинск-стройматериалы». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № ___ .

Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 – 13.10.2020 по 17.00 – 29.10.2020** по адресу: г. Пинск, ул. Пучкова, 14.

Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах: документ, подтверждающий внесение суммы задатка; для юридических лиц – копия свидетельства о государственной регистрации юридического лица, доверенность представителю юридического лица (если юридическое лицо представляет не руководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица; для индивидуальных предпринимателей – копия о государственной регистрации индивидуального предпринимателя. При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал и копию документа, удостоверяющего личность.

К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Продавцу стоимость затрат по размещению в газете (на основании счета-фактуры) в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в день проведения торгов. Участник, выигравший торги, и все присутствующие члены комиссии подписывают протокол о результатах торгов в трех экземплярах. Один экземпляр протокола выдается участнику, выигравшему торги, и является документом, удостоверяющим его право на заключение договора. Второй экземпляр протокола выдается антикризисному управляющему, а третий – организатору торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение 5 (пяти) рабочих дней с даты проведения торгов.

Вучымся дамаўляцца

# Тэхніка «пяці навошта»

## Як медыятары дапамагаюць зразумець сапраўдную прычыну канфлікту

**Прынцып паспяховасці перагавораў — уменне размаўляць на ўзроўні інтарэсаў, а не пазіцый, сцвярджаюць медыятары. Зразумець, што ў чалавека — пазіцыя, а што — інтарэс, і што ён пераследуе, калі ўступае ў канфлікт з іншым бокам, і ёсць задача медыятара — спецыяліста па дасудовым урэгуляванні спрэчак. Менавіта гэтыя людзі за некалькі сустрэч са спрачальнікамі, а часам і за адну, дапамагаюць людзям пачуць адзін аднаго і зразумець, што насамрэч ім патрэбна, за што яны, здараецца, не адзін год б'юцца ў судах. Як шляхам простых пытанняў адкрыць людзям вочы на іх сапраўдныя, а не надуманыя інтарэсы, Алеся ПУХАВА, бізнес-юрыст, медыятар Цэнтра медыяцыі і перагавораў, прапанавала разабрацца на прыкладах.**



### «ХАЧУ МІЛЬЁН ДОЛАРАЎ!» НАВОШТА ЁН ВАМ?

Пазіцыя — гэта тое, з чым да медыятара прыходзіць чалавек. Ён кажа «мяне падманулі», «у мяне ўкралі», «я не згодны», «я хачу вось так». І напачатку незразумела, гэта факт ці меркаванне. Пакуль гэта тое, што ён найперш заяўляе ўсяму свету, — пэўныя факты і меркаванні. Адны з іх абгрунтаваць можна, іншыя — не. Напрыклад калі чалавек кажа «мне здаецца, мяне не паважаюць» або «я хачу мільён долараў, бо ён мне вінен», трэба капаць глыбей і выходзіць на ўзровень інтарэсаў, сцвярджае Алеся Пухава.

Інтарэсы — гэта тое, што схавана за словамі, якія чалавек кажа на перагаворах у першую чаргу, акрэсліваючы сваю пазіцыю. У межах інтарэсаў можа быць недахоп **інфармацыі.** За перакананнем «мяне падманулі» можа стаяць мноства варыянтаў развіцця падзей. Падманулі таму, што сказілі інфармацыю, не далі яе...

Гэта можа быць звязана з **паводзінамі,** бо ўсе прывыклі да пэўнага алгарытму: вітацца пэўным чынам, святкаваць нешта, а гэты парадак раптам парушаецца. **Адносіны** бакоў існуюць у пэўных звыклых межах. Напрыклад, муж заўсёды прыносіць дадому зарплату, і гэтая практыка — бах! — парушаецца. Інтарэсы — гэта ж яшчэ і **каштоўнасці:** вера, погляды і многае іншае.

*— Пры разыходжанні інтарэсаў і ўзнікае канфлікт. І даведацца, які інтарэс крыецца за жаданнем «я хачу мільён», і ёсць задача медыятара. Калі ў адказ на словы «я хачу мільён» задаць пытанне «навошта ён вам?», вы пераходзіце на прыступку ніжэй — звяртаецеся да інтарэсаў. І тут можа быць мільярд адказаў. Напрыклад: «Ён мне вінен. Узяў грошы, хай аддае. Ён павінен трымаць сябе як мужык». У гэтым выпадку зразумела, што мільён патрэбны не для набыцця чагосьці, а чалавеку важна, каб партнёр пытрымліваўся пэўных правілаў — напрыклад, узяў — аддаў; яму важна, як праявіць сябе партнёр, а не само валоданне мільёнам. Яшчэ адзін варыянт: мільён патрэбны яму, каб разлічыцца са сваімі даўгамі, інакш ён згубіць уласных кліентаў. Тут таксама інтарэс у захаванні адносін са сваімі партнёрамі, а не ў валоданні мільёнам. За інтарэсамі стаяць патрэбы. І калі спытаць, «навошта вам захоўваць партнёрскія адносіны?», можна яшчэ больш паглыбіцца ў праблему. Бо чалавек скажа, напрыклад, што яму важна заставацца паважаным у сваёй сферы, быць прызнаным як надзейны гулец. І гэта яго сацыяльныя патрэбы. Разумеючы сітуацыю ўжо на такім узроўні, можна далей і яшчэ больш паспяхова распрацоўваць варыянты рашэнняў. Напрыклад, дапамагчы стварыць версію, пры якой чалавек захавае аблічча перад партнёрамі, а не проста верне свой мільён. Пры разборы сітуацыі ў гэтым кірунку той, хто спагнае доўг, сам можа прапанаваць выйсце, накшталт «хай тады іншы бок пакіне гарантыю, што гэта не я дрэнны, а ён не аддае грошы ў сувязі з чым я не магу накіраваць сродкі, куды мне трэба».*

Увогуле, каб, як той казаў, дакапацца да ісціны і зразумець, чаго хоча чалавек, медыятар можа выкарыстоўваць тэхніку «пяці навошта». Калі задаваць гэтыя пытанні, яны дапамагаюць медыятару пачуць чалавека і даць дапамагчы яму зразумець, чаго ён хоча. На прыкладзе з мільёнам долараў гэта дзейнічаць прыкладна так. «Мне патрэбны мільён долараў. — «Навошта ён вам?» — Я хачу купіць вялікі дом. — Навошта вам вялікі дом? — Я хачу, каб туды прыходзілі шмат гасцей і мы добра бавілі час. — А навошта вам шмат гасцей і весялосці? — Для мяне важна камунікаваць і быць часткай пэўнай групы, якая можа шмат сабе дазволіць і дапамагчы мне вырашыць нейкія мае праблемы. І вось пасля выслухоўвання гэтага адказу становіцца зразумела, што сапраўдная патрэба чалавека, які хоча мільён долараў, знаходзіцца нават ніжэй за яго інтарэс — ён проста хоча быць часткай пэўнай групы. І на любым з гэтых узроўняў можна шукаць нейкія рашэнні, патлумачыла медыятар. Такім чынам грошы могуць быць пазіцыяй, аднак не інтарэсам і не патрэбай. Хіба што, за выключэннем выпадку, калі валоданне грашыма зніжае ўзровень страху — грошы ляжаць на рахунку і ствараюць пачуццё бяспекі тым, што яны проста ёсць.

### «У ЯГО ЁСЦЬ ПАЛЮБОЎНІЦА. НАМ ТРЭБА РАЗВОДЗІЦЦА»

«Я абсалютна ўпэўнена, што ў яго ёсць каханка, таму нам трэба скасаваць шлюб. Іншага выйсця я не бачу». Гэта пазіцыя жонкі, з якой яна прыходзіць да медыятара, — яшчэ адзін прыклад, які прапанавала разабраць Алеся Пухава, задаючы гераіні пытанні, што дапамогуць высветліць, чаго ж яна насамрэч жадае.

«Чаму вы так у гэтым упэўнены? Якія факты пацвярджаюць, што ёсць палюбоўніца?»

«Ён штомесяц прыносіў дадому заробак, а цяпер — толькі яго палову. Куды ён дзявае грошы?! Вядома ж, на маладых жанчын!»

«Ці пыталіся вы ў мужа, на што менавіта ён траціць грошы?»

«Яшчэ не, але мне здаецца, што на жанчын!»

*— Бачна, што дакладнага адказу тут няма. Магчыма, муж збірае грошы на цудоўны падарунак для жонкі, і ніякай каханкі ўвогуле не існуе, — пракаментавала спецыяліст.*

«Ці змянілася стаўленне мужа да вас?»

«Здаецца, не, але мяне пужае, што ён пусціць усё на каханку, і я буду жыць горш».

«Як на вас уплывае наяўнасць каханкі ў вашага мужа?»

«Ну як? Калі ў яго ёсць маладая і ён на яе траціць грошы, мы развядзёмся і я застануся ні з чым?! Не! Мне трэба разумець, што дом, машына і іншыя матэрыяльныя даброты застануцца са мной».

«Развод — адзіны спосаб вырашыць праблему?»

«Калі мы будзем разводзіцца цяпер, то ў мяне будуць паперы, згодна з якімі мне застанецца палова, што належыць мне. Я не магу чакаць, пакуль ён спусціць усё на сваіх жанчын, мне трэба забраць сваю палову цяпер, захаваць яе!»

*— Атрымаўшы такія адказы, мы высветлілі патрэбу жонкі ў матэрыяльным забеспячэнні сваёй будучыні. Яна баіцца не разводу і не наяўнасці каханкі, а будучыні без даброт, якія ў яе ёсць зараз. І пасля ўжо можна пераходзіць да пошуку інтарэсаў жонкі, звярнуўшыся да яе эмоцый. Пакуль чалавеку няма чаго есці і няма дзе жыць, ніякія эмоцыі не будуць на першым месцы. Таму, задаючы пытанні, трэба пачынаць з базавых патрэб, якія ёсць у людзей,* — удакладніла медыятар.

«Якім чынам, акрамя разводу, вы можаце атрымаць для сябе гэтую бяспеку?» — такім можа быць наступнае пытанне ў разборы падобнай сітуацыі.

«Ну, можам, напэўна, падпісаць шлюбны дагавор».

«Ці можна гэта абмеркаваць з вашым мужам? Каб ён задаволіў вашы патрэбы ў бяспецы, перапісаў кватэру, вызначыў суму аліментаў, каб вам стала спакайней і вы маглі далей падумаць над вашымі адносінамі».

*— Такім дыялогам вы дапамагаеце жонцы выдыхнуць і задумацца, што рабіць, бо дагэтуль яна бачыла адно выйсце — тэрмінова скасоўваць шлюб. А вы дапамаглі зразумець, навошта ёй гэта, і як інакш можна вырашаць праблему. І калі да сустрэчы пазней далучыцца муж, то можна ўжо будзе весці гаворку і пра іх адносіны, — патлумачыла Алеся Пухава.*

Вось прыкладна так і працуе медыятар, каб высветліць, што за інтарэсы пераследуе чалавек, кіруючыся сваёй пазіцыяй, і знайсці дзейсныя рашэнні, якія могуць задаволіць патрэбы ўсіх. І гэта толькі адзін маленечкі навык. Ім авалодвае чалавек, які вырашае стаць прафесійным медыятарам і ідзе вучыцца ў Цэнтр медыяцыі і перагавораў. Міністэрствам юстыцыі, якое выдае пасведчанне медыятара, вызначаны дакладная праграма і тэрмін навучання: 140 гадзін для тых, хто мае вышэйшую юрыдычную адукацыю, і 170 — для ўсіх астатніх. Спецыялісты кажуць, што ў аснову навучання ў Цэнтры пакладзены трэнінг, які дзейнічае згодна з выслоўем вялікага Канфуцыя: «Скажы мне — і я забудуся, пакажы мне — і я запомню, дай мне зрабіць — і гэта стане маім назаўжды».



Сапраўды, паспрабаваць выкарыстоўваць падобную практыку перагавораў і задаваць пытанні пры жаданні можа кожны, каб захаваць адносіны з блізкімі. Тыя, хто прайшоў навучанне, нават не збіраючыся пасля станавіцца медыятарам, кажуць, што іх паўсядзённыя ўзаемадачыненні з людзьмі якасна змяніліся. І яны зразумелі сутнасць выслоўя: «самыя шчаслівыя — тыя, хто змог выбудаваць добрыя адносіны з іншымі людзьмі».

---

Будзь у курсе!

## 14 кастрычніка — прававыя адказы для мам

Спецыялісты Міністэрства юстыцыі, Беларускай натарыяльнай палаты, Рэспубліканскай калегіі адвакатаў і галоўных упраўленняў юстыцыі аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама бясплатна пракансультуюць мам па пытаннях працоўнага, грамадзянскага, сямейнага і жыллёвага права.

Эксперты Мінюста будуць працаваць з мамамі 14 кастрычніка ў фармаце прамых тэлефонных ліній з 11.00 да 13.00. Пералік нумароў тэлефонаў і спецыялістаў ведамства можна знайсці на сайце Міністэрства юстыцыі і ў Тэлеграм-канале прэс-службы Мінюста.

Спецыялісты Беларускай натарыяльнай палаты запрашаюць жанчын, якія выхоўваюць траіх і больш дзяцей, звярнуцца да натарыуса па пытаннях спадчынных правоў, адчужэння маёмасці, складання завяшчанняў, засведчання даверанасцяў, здзяйснення выканаўчых надпісаў і іншых праблем, у вырашэнні якіх могуць дапамагчы натарыусы. Поўны спіс натарыяльных кантор і натарыяльных бюро, час іх працы і нумары тэлефонаў можна ўдакладніць на сайце belnotary.by ў раздзеле «Знайсці натарыуса». Фармат зносін з натарыусам таксама можна ўдакладніць па тэлефоне.

Адвакаты дапамогуць мамам вырашыць пытанні, якія датычацца сямейных, жыллёвых, грамадзянскіх і працоўных праваадносін. А медыятары раскажуць, як пазбегнуць сур'ёзных праблем з дапамогай аднаўленчай, школьнай і сямейнай медыяцый.

**Матэрыялы падрыхтавала Ірына СІДАРОК.**

Беларускі пантэон

# Як Францішак Смуглевіч беларускую ўтопію маляваў



**Люблю блукаць па старых могілках... Уяўляць людзей, якія калісьці ішлі ў паспалітае рушэнне і біліся на двубоях, будавалі палацы і прайгравалі ў фараона апошні грош, ладзілі пышныя балі і лекавалі «жывёльным магнетызмам», замаўлялі крыналіны з Парыжа і малявалі партрэты ў антычным стылі... Цені мінулага... Добра, калі застаўся хоць камень, у выбітыя ў якім літары запаўзае мох... А часцяком — толькі безыменная купка травы альбо выраслае на месцы былой магілы дрэва, няхай пры жыцці той, хто тут ляжыць, спазнаў усе забабы славы, а пасля смерці ўвайшоў у энцыклапедыі. Пра гэта я думала і на віленскіх могілках Роса, дзе спачываюць шмат якія дзеячы беларускае гісторыі. Дзесьці тут і магіла мастака Францішка Смуглевіча, месцазнаходжанне якой страчанае яшчэ ў пазамінулым стагоддзі...**

Мікола Ермаловіч, асleплы гісторык, які адкрываў таямніцы Вялікага Княства Літоўскага, пералічваў у вершы «Сябрам Літвы» славутых людзей, што зрабілі ўнёсак у культуру і беларусаў, і іх суседзяў, і заклікаў не сварыцца нарэшце іх прыналежнасці:

*«Суседзі, сябры!*
*Мы падзелімся славай,*
*не будзем пасёння хаваць*
*пад крыло*
*сумеснае гора сумеснай*
*дзяржавы,*
*сумесных крыніц жарало.*
*У нас быў Пачобут*
*і быў Каліноўскі,*
*Смуглевіч і Рушчыц,*
*Міцкевіч і Зан...»*

Сапраўды, хоць народжанага ў Варшаве 275 гадоў таму Францішка Смуглевіча часта называюць менавіта польскім мастаком, ён застаўся ў гісторыі і літоўскага, і беларускага мастацтва. Больш за тое — яго называюць адным з заснавальнікаў беларускай мастацкай школы!

## ПЯЦЬ БРАТОЎ-МАСТАКОЎ

А належыць Францішак да мастакоўскай дынастыі. Бацька, Лукаш Смуглевіч, усіх пяцёх сыноў навучыў свайму рамяству. І, напрыклад, чытаючы пра касцёл у Падгорцах каля Львова, натрапляем на звесткі, што роспісам інтэр'еру радавой усыпальніцы Жавускіх там займаўся Лукаш Смуглевіч з сынам, а было гэта дзесь у 1760-х гадах. Праўда, наўрад ці гэта быў менавіта Францішак — хіба што прыехаў на нейкі час з Рыма.

Не было тады для мастака больш жаданай творчай вандроўкі, як у Італію... Францішак вучыўся там у 1763—1764 гадах, ягоным настаўнікам у мастацкай акадэміі Святога Лукі быў аўстрыец Антон фон Марон, аўтар выдатных партрэтаў каранаваных асоб. Прычым вучыўся Смуглевіч на стыпендыю караля Станіслава Панятоўскага. Пасля нейкі час працаваў у Італіі... А калі вярнуўся, пачаў зарабляць заказамі ад радавітых персон. І дзе толькі на Беларусі мы не знаходзім слядоў пэндзля яго альбо ягонай мастакоўскай сямейкі! У храмах Менска, Полацка, Гародні, Рэчыцы... Для храма ў Сігневічах на Берасцейшчыне Францішак намаляваў партрэт сям'і ўладальніка маёнтка Юзафа Прозара. У навагрудскім фарным касцёле быў абраз ягонай работы. Па акварэлях Смуглевіча мы ведаем, як выглядала тады старажытная Вільня. У Віленскім універсітэце ёсць зала, распісаная Смуглевічам разам з братам Антоніем.

Лічаць, што аўтарам вядомага партрэта князя Мацея Радзівіла з пляменнікам са збораў Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі таксама з'яўляецца Францішак Смуглевіч. У свой час Мацей Радзівіл выйграў барацьбу за апякунства над пляменнікам Дамінікам Радзівілам, спадчыннікам самога Пане Каханку, які не меў уласных дзяцей. Кампазітар, драматург, апошні віленскі кашталян Мацей Радзівіл удзельнічаў у падрыхтоўцы паўстання Касцюшкі, за што быў пазбаўлены права апекі над Дамінікам. Пабываў у эміграцыі, дажываў у Паланечцы на Навагрудчыне. Смуглевіч пісаў яго, напэўна, у 1791 годзе, калі той яшчэ быў на пасадзе віленскага кашталяна.

## УТОПІЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

А найбольш зачапіла маю ўвагу намаляваная Францішкам на замову карціна «Павел Ксаверы Бжастоўскі аб'яўляе Статут сялянам Паўлава». Дата яе напісання — 1795.

І гэта зусім не шараговая замова, і зусім не выпадковая дата.

Павел Ксаверы Бжастоўскі, вялікі пісар літоўскі, быў вялікі прагрэсіст і прыхільнік філасофіі фізіякратаў. Фізіякраты лічылі, што грамадства — адзіны арганізм, у якім мусяць дзейнічаць «натуральныя законы», дзе няма месца саслоўнаму падзелу. Бжастоўскі шанаваў ідэі Жана Жака Русо, Шарля Фур'е, Сен-Сімона і Томаса Мора і, калі набыў на Ашмяншчыне маёнтак Мерач, вырашыў, што наспеў час здзейсніць мары ўлюбёных філосафаў. Тым болей, халопы Мерачы былі страшэнна бедныя і забітыя, чаму не паглядзець, як уплывае на чалавека свабода? 10 сакавіка 1767 года Павел Бжастоўскі абвясціў у сваім маёнтку Мерач... рэспубліку. У міні-дзяржавы з'явілася свая канстытуцыя, згодна з якой усе жыхары аб'яўляліся роўнымі, уводзілася сялянскае самакіраванне, мусіў выбірацца двухпалатны сейм і міністэрствы, усе пытанні вырашаліся галасаваннем. Узначальваць рэспубліку, вядома, належала пажыццёва самому Паўлу Бжастоўскаму. Нават назву вёскі ўдзячныя пейзане змянілі, і адгэтуль яна стала называцца Паўлаўскай рэспублікай. У нованароджанай дзяржавы з'явілася свая армія ў адмысловай форме, банк, дзе сяляне маглі браць пазыкі на льготных умовах, школа і шпіталь. Пачалі нават чаканіць манеты.

Можаце сабе ўявіць, як узбурылася мясцовая шляхта! Рэспубліка, дэмакратыя, адмена саслоўяў — і ўсё пад бокам! Бжастоўскага спрабавалі абвясціць вар'ятам, дзяржаўным злачынцам, блюзнерам... Але ў сваіх уладаннях шляхціц мог рабіць, што заўгодна — вунь Марцін Радзівіл ледзь не чорныя месы ўчыняў, уласных жонку і дзяцей трымаў у зняволенні, набраўшы па суседніх вёсках «кадэтак» — гарэм, бо жадаў прыпадобніцца даўнім усходнім уладарам і тым паспрыяць сваім поспехам у алхіміі. Дапамагала і тое, што на фізіякратыю існавала мода. Падскарбій Антоній Тызенгаўз пры падтрымцы караля запрашаў прыехаць на Літву Жана Жака Русо, абяцаючы спрыянне ягоным рэформам. Магнаты перапраналіся ў сялян і бавілі час, слухаючы народных музыкаў. Пляменнік караля, ягоны цёзка Станіслаў Панятоўскі сабраў сялян са сваіх уладанняў на баль і абвясціў, што адпускае на волю, пра што адным паэтам тут жа была напісаная пафасная паэма.

Але Бжастоўскі пайшоў далей за ўсіх. І 4 красавіка 1791 года, ужо на схіле Рэчы Паспалітай, дабіўся зацвярджэння на сейме статута, то-бок канстытуцыі сваёй Паўлаўскай Рэспублікі. У 1794-м жыхары ўжо паўнавартаснай мініяцюрнай дзяржавы выставілі ў войска Касцюшкі за свой кошт 150 вершнікаў і дзве гарматы.

А ў 1795-м Рэч Паспалітая была знішчана. Павел Ксаверы Бжастоўскі прадаў Мерач, то-бок Паўлаўскую рэспубліку, праўда, з умовай, што ўведзеныя ў ёй парадкі застануцца непарушныя, і з'ехаў за мяжу.

Так што на карціне, намаляванай Францішкам Смуглевічам, сучаснікі прачытвалі вельмі сур'ёзныя падтэксты. Сюжэт, як Павел Бжастоўскі зачытвае сялянам Статут Паўлаўскай рэспублікі, быў адлюстраваны ў той час, калі тая рэспубліка ўжо знікла, як і Рэч Паспалітая. Тое, што мастак маляваў не проста так, пацвярджаецца фактам: у 1797-м ён стварыў карціну «Прысяга Тадэвуша Касцюшкі на Кракаўскім рынку». У гэты час Касцюшка, вызвалены пасля смерці імператрыцы Кацярыны новым расійскім імператарам Паўлам, ад'язджаў у Амерыку.

Цікава, што ў 1800—1801 гадах Францішак Смуглевіч распісваў Міхайлаўскі замак у Санкт-Пецярбургу, які належаў імператару Паўлу. І яшчэ дэталь: брат Францішка Смуглевіча Антоній аздабляў палац у Шчорсах, уладальнік якога Храптовіч спрабаваў стварыць у сваіх уладаннях падабенства Паўлаўскай рэспублікі.



Карціна Францішка Смуглевіча «Павел Ксаверы Бжастоўскі аб'яўляе Статут сялянам Паўлава», 1795.

## НАСТАЎНІЦКІ ЛЁС

Вядома, што не кожны выдатны мастак, пісьменнік ці артыст здольны быць такім жа выдатным педагогам. Творчыя людзі — яны складаныя і часта эгацэнтрычныя... Францішак Смуглевіч, падобна, педагагічны талент меў. Выкладаць пачаў яшчэ ў Варшаве, пасля вяртання з Рыма. У яго школе вучыўся славуты польскі мастак-вандроўнік Юзаф Пешка. А вось калі рэфармавалі Віленскі ўніверсітэт, зрабіўшы яго свецкай установай, з'явіўся шанц на большае. Пры Галоўнай літоўскай школе, або Галоўнай віленскай школе, — так пачаў называцца ўніверсітэт — адкрылася школа малявання. Яна пачалася з кафедры жывапісу і малюнка, якую ў 1797 годзе заснаваў і ачоліў Францішак Смуглевіч. За 35 гадоў існавання школа падрыхтавала больш за 250 мастакоў, гравёраў, скульптараў.

Асяродак быў самы вальнадумны — яшчэ не сышло водгулле паўстання, згадайце, што менавіта ў год заснавання кафедры Смуглевіч малюе Касцюшку. Сярод калег Жан Жылібер — француз, запрошаны Антоніем Тызенгаўзам дзеля заснавання медычнай школы ў Гародні. Пасля адстаўкі Тызенгаўза Жылібер быў змушаны пакінуць Гародню і перабраўся ў Вільню. Выкладаў на наваствораным медычным факультэце, заснаваў батанічны сад, даследаваў мінералы і расліны... А таксама ачольваў масонскую ложу, у якую, між іншым, увахадзіў нават Панятоўскі. Рэктар Галоўнай віленскай школы, Марцін Пачобут-Адляніцкі, быў астраномам і таксама прагрэсістам. Пра навучанне ў Францішка Смуглевіча ўспаміналі Іосіф Аляшкевіч, Канстанцін Ельскі, Ян Дамель. Вядома пра методыку, якую той ужываў. Ён вёў выкладанне ў тры этапы. Напачатку — капіяванне грэчаскіх выяў, потым — маляванне з гіпсавых мадэляў, потым — маляванне з жывой мадэлі. А таксама Францішак лічыў, што мастаку акрамя прафесійнага навучання неабходна авалодаць асновамі мноства розных навук. Лекцыі па жывапісе працягласцю паўтары гадзіны Смуглевіч чытаў тры разы на тыдзень, па малюнку два разы на тыдзень, па паўтары гадзіны чытаў ад'юнкт Ян Рустэм, які вядомы па працы ў знакамітым Слонімскім тэатры Міхала Казіміра Агінскага. Менавіта Рустэм і змяніў Францішка Смуглевіча на пасадзе загадчыка кафедры пасля смерці таго ў 1807 годзе.

Спадчына Францішка Смуглевіча ўвайшла ў тры культуры — польскую, літоўскую і беларускую. У Вільнюсе, напрыклад, ёсць вуліца яго імя. Але, як слушна зазначыў у вершы Мікола Ермаловіч, мы маем права на агульную гісторыю.

*Не будзем дзяліць мы ні замкі,*
*ні троны,*
*траістую музыку,*
*узоры крыжоў:*
*над намі дубоў*
*пакручастыя кроны,*
*над намі луска*
*бальшаковых глыжоў.*

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**



Зала Смуглевічаў у Вільнюскім універсітэце.

Музейная справа

# ПЛАН НАВЕДВАННЯ АДНОЙ ВЫСТАЎКІ,

## або З якімі «мастадонтамі» будзе знаёміць Нацыянальны гістарычны музей

**Сёння ў Нацыянальным гістарычным музеі пачынае працаваць выстаўка «Археалагічны помнік: фіксацыя мінулага ў мінулым».**

Напярэдадні нам удалося пазнаёміцца з цікавосткамі экспазіцыі.



### Дакрануцца да вытокаў

— Гледзячы на гэту назву, можна падумаць, што знаёміць яна будзе са старажытнасцямі, знойдзенымі на нашай зямлі ці іх візуальнымі выявамі, — заўважае **навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі, нумізматыкі і зброі Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь Вікторыя ТАРАСЕВІЧ.** — Але храналагічны перыяд гэтага выставачнага праекта ахоплівае пачатак XX стагоддзя, і звязаны ён у асноўным з дзейнасцю такіх археолагаў, як Аляксандр Ляўданскі, Сяргей Дубінскі, Канстанцін Палікарповіч, Ісаак Сербаў і іншых, у тым ліку тых, хто вялі даследаванні на землях Заходняй Беларусі, якія ў 1920—1930-х гадах належалі Польшчы.

На жаль, імёны «мастадонтаў беларускай археалагічнай навукі», як ахрысцілі супрацоўнікі музея даследчыкаў 20—30-х гадоў мінулага стагоддзя, сёння вядомыя толькі вузкаму колу людзей, пераважна іх паслядоўнікам — археолагам і гісторыкам. Але ні ў якім падручніку сёння ніхто не прачытае пра здзяйсненні і адкрыцці тых людзей. І гэта пры тым, што іх напрацоўкамі мы карыстаемся і сёння. Менавіта яны сталі каля вытокаў сучаснай археалагічнай навукі і не толькі. Абуджэнне цікавасці да ўласнай гісторыі і культуры, актыўнае развіццё археалагічных даследаванняў у 20-я гады цесна звязана з дзяржавастваральнымі працэсамі. У той час, можна сказаць, модна было ўдзельнічаць у краязнаўчых гуртках, зараджаўся попыт на інфармацыю, звязаную з гісторыяй. Даследаванні бясспрэчна спрыялі фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці.



Стратыграфіі, зробленыя Язэпам Драздовічам у Свіры.

У пачатку мінулага стагоддзя ладзіліся шматлікія экспедыцыі — прычым дакументы сведчаць, што на вывучэнне краю выдзяляліся добрыя грошы. Менавіта дзякуючы тым напрацоўкам мы ведаем, калі першыя людзі засялілі беларускія землі. Верхнепалеалітычная Бердзежская стаянка вывучалася шматлікімі даследчыкамі. І па сёння гэта адзін з нешматлікіх помнікаў на беларускіх землях, якія адносяцца да настолькі даўніх часоў. Навука ідзе наперад, адкрываюцца новыя помнікі, але даследаванні, зробленыя сто гадоў таму, застаюцца эталоннымі. Вялікія сілы былі кінутыя і на вывучэнне Банцараўскага гарадзішча, размешчанага пад Мінскам. Менавіта з ім звязана ўзнікненне такога паняцця, як банцараўская археалагічная культура. Варта адзначыць, што з 20—30-х гадоў работы археолагаў становяцца профільна скіраванымі на вывучэнне помнікаў пэўных перыядаў.

— Калі мы, сучасныя археолагі, чуем «даваенная археалогія», «даваенныя помнікі», адчуваем гонар, што мы займаемся тым, чым займаліся гэтыя людзі да нас, працягваем іх працу, — заўважае Вікторыя Тарасевіч. Тое, на якім узроўні праводзіліся экспедыцыі сто гадоў таму, уражвае і сёння. Тагачасныя археолагі былі ўсебакова развітыя асобы, жывыя энцыклапедыі. Напрыклад, раскопкі, што праводзіў Аляксандр Ляўданскі, адпавядалі самым перадавым метадыкам, ён маляваў планы, замалёўваў прадметы, рабіў фотафіксацыю, у яго было вельмі шмат здымкаў (але, на жаль, многія з іх прапалі ці знішчаны). Даследчыкі вялі палявыя дзённікі. Да таго ж работы былі мультыдысцыплінарныя, комплексныя. Побач з археолагамі працавалі гісторыкі, музейшчыкі, геолагі. Зараз мала якая экспедыцыя можа пахваліцца такім наборам спецыялістаў, што выязджаюць на адны раскопкі.

На выстаўцы прадстаўлены арыгіналы і копіі графічных замалёвак, выкананых адным з найбольш выдатных мастакоў Беларусі Язэпам Драздовічам. Гэты ўнікальны чалавек вядомы нам як пісьменнік, астраном-аматар, настаўнік, этнограф, а часам некаторыя энцыклапедыі падаюць яго і як археолага. Насамрэч раскопак Язэп Драздовіч не праводзіў, але археалогіяй сапраўды цікавіўся.

«Магчыма, гэтая блытаніна ўзнікла, бо ў некаторых музейных фондах захоўваюцца археалагічныя матэрыялы, падпісаныя як калекцыя Драздовіча. У тым ліку і ў нашым музеі маюцца скрыні, унутры якіх змешчаны планшэты з падшытымі на іх археалагічнымі знаходкамі. Яны падпісаны Язэпам Драздовічам, і на выстаўцы дэманструецца адна з такіх яго калекцый, — расказвае Вікторыя Тарасевіч. — У нас захоўваюцца матэрыялы яго паверхневых збораў, якія ён здзяйсняў у той час, калі ў Навагрудскім замку праводзіліся работы па кансервацыі руін. Архітэктары працавалі менавіта над гэтымі аспектамі, іх не цікавіў культурны слой і тое, што там знаходзіцца. Драздовіч, які там выкладаў у свой навагрудскі перыяд жыцця, сабраў гэтыя рэчы, нашыў на планшэты, некаторыя з іх аздобіў, зрабіў графічныя замалёўкі і рэканструкцыі — і ў такім выглядзе яны дайшлі да нас. Ёсць помнік — гарадзішча Свір, яно знаходзіцца ў цэнтры пасёлка. У даваенны час атрымалася так, што нейкую частку гарадзішча з паўднёвага боку проста зрэзалі. Драздовіч у той час там адпачываў і бачыў, як знішчылі палову помніка, зрабіў некалькі замалёвак. Да нас дайшлі малюнкі яго стратыграфій і помнікаў.

### Вярнуць страчанае

На выстаўцы ў Нацыянальным гістарычным музеі будуць прадстаўлены фотаздымкі помнікаў археалогіі, якія даследаваліся ў тыя часы. Праводзіліся не толькі раскопкі, але і шырокамаштабныя разведкі. Каштоўнасць старых дакументаў яшчэ і ў тым, што сто гадоў таму археолагі паспелі зафіксаваць вельмі многія помнікі, якія не дажылі да нашых часоў. У тым ліку імі была праведзена і вялікая фотафіксацыя.

Захавалася інфармацыя, што яны ладзілі настолькі буйныя разведкі, што атрымалася каля васьмі тысяч картак з фотаздымкамі і апісаннямі помнікаў. Вось толькі з-за пэўных абставінаў у 30-я гады і вайну дакументы, справаздачы і фотаздымкі археолагаў зніклі. А тое, што захавалася, даводзіцца па калеву збіраць — аднаўляць інфармацыю па фотаздымках, фрагментах дакументаў, публікацый, якія яны паспелі зрабіць. Адна з такіх крыніц, дзякуючы якой можна вярнуць гістарычныя веды — тры тамы работ па археалогіі, што выйшлі ў даваенныя гады, дзе на вельмі высокім узроўні апісаны названыя раскопкі і тое, што было на іх атрымана. І гэтай крыніцай актыўна карыстаюцца сучасныя даследчыкі, бо старыя публікацыі мала таго што вельмі добра напісаны, але яшчэ і маюць выявы прадметаў, якія былі знойдзены ў тыя часы. Самі ж знаходкі археолагаў у час Другой сусветнай вайны былі вывезены з тэрыторыі Беларусі. Калі ж яны вяртаюцца, часам даводзіцца праводзіць сапраўдныя расследаванні, каб высветліць, адкуль пэўныя прадметы, супастаўляць даваенныя публікацыі і параўноўваць з выявамі ў іх. Сёння такая праца па пошуку прадметаў і вяртанні апошніх у навуковы ўжытак праводзіцца на базе Нацыянальнага гістарычнага музея і Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Дарэчы, наведвальнікі выстаўкі змогуць пазнаёміцца з некаторымі фотаздымкамі і знаходкамі экспедыцый першай паловы XX стагоддзя, якія ўдалося зберагчы.

### Паглыбіцца ў прафесію

Асаблівую цікавасць у наведвальнікаў могуць выклікаць побытавыя фотаздымкі з археалагічных экспедыцый тых часоў: як людзі гатавалі ежу, спалі ў паўзямлянках, сплаўляліся на лодках па рацэ.

— Археалогія — гэта не толькі рамантыка, але і даволі цяжкая праца. Калі мы зараз уяўляем лясныя выезды, разумем, што можна узяць боты, намёты, парасоны, тэнты, спецыяльную вопратку для дрэннага надвор'я. Сто гадоў таму такога не было. І калі бачыш старыя фотаздымкі, дзе пад сонцам з рыдлёўкай стаяць мужчыны ў касцюмах, альбо дзяўчаты ў капялюшыках, гэта цікава, але разумееш, як ім было нязручна, — заўважае **навуковы супрацоўнік экспазіцыйнага аддзела Нацыянальнага гістарычнага музея Данута ГРЫНЬ.**



Даследчыкі падказваюць, як сэканоміць падчас экспедыцыі.

Сёння ў Беларусі крыху больш за 50 дзеючых археолагаў, і гэта вельмі мала для нашай тэрыторыі і той колькасці археалагічных помнікаў, якія на ёй знаходзяцца. Толькі ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі на сёння больш за дзве тысячы археалагічных аб'ектаў. І гэта невялікая колькасць помнікаў археалогіі, якія вядомы па навуковых крыніцах. Работа па ўключэнні ў спіс новых помнікаў вядзецца вельмі марудна. Усё часцей сустракаюцца сумныя навіны пра знішчэнне ці пашкоджанне помнікаў, якія не знаходзяцца пад аховай. І таму адна з мэт выстаўкі — прыцягнуць увагу грамадскасці да захавання гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Што, як не знаёмства з работай археолага, наогул з археалагічнай навукай, можа стаць найлепшай прышчэпкай ад абыякавасці?

Трэба сказаць, што выстаўка — складнік надзвычай вялікага музейнага праекта, «Мінулае мае будучыню: дыялог культуры і навукі», у межах якога ладзіцца шэраг разнастайных мерапрыемстваў па папулярызацыі археалагічнай дзейнасці.

Данута Грынь згадала, як засмучалася з нагоды таго, што ў Гальшанах падчас будаўнічых работ было знішчана сярэдневекавое пахаванне (знаходкі былі проста выцягнуты з-пад трактара), на што пачула ў адказ: «Ну і ў чым праблема? Вы ж усё роўна дасталі прадметы з гэтай кучы зямлі». На жаль, людзі не разумеюць, што важна і тое, дзе і як ляжаў пэўны прадмет, і што па розных дробных дэталях можна чытаць гісторыю. А галоўнае, такая інфармацыя можа быць больш каштоўная, чым сама знаходка.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

---

Славутыя землякі

# НАШ АЙЗЕК АЗІМАЎ

**І няхай гэта не бянтэжыць тых, хто прывык лічыць яго амерыканскім пісьменнікам. Справа ў тым, што яго малая радзіма — вёска Пятровічы, што на Смаленшчыне. Але ў 1920 годзе, калі маленькі Ісаак (сапраўднае імя пісьменніка) з'явіўся на свет, вёска ўваходзіла ў склад Клімавіцкага павета — сёння гэта аднайменны раён Магілёўскай вобласці.**

Пра сувязі выдатнага фантаста з беларускім мінулым згадалі падчас трохдзённых Азімаўскіх чытанняў у расійскіх Шумячах. На іх было вырашана прэзентаваць Шумячыцкаму і Клімавіцкаму музеям карціны смаленскага мастака Аляксея Храмава з выявай пісьменніка і членаў яго сям'і.

— Палотны былі напісаны ў год стагоддзя Азімава па замове Агенцтва інтэграцыйных ініцыятыў, — паведаміла **дырэктар Клімавіцкага краязнаўчага музея Наталля БАНЬШЭЎСКАЯ.** — Дагэтуль у нашых фондах не было ніводнага прадмета, звязанага з імем фантаста. Вельмі прыемна, што гэты прабел нарэшце ліквідаваны. Карціны прыедуць да нас, як толькі адкрыецца мяжа паміж нашымі краінамі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## Закрытое акционерное общество «Белорусско-Швейцарский банк «БСБ Банк»

www.bsb.by

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 октября 2020 года

Закрытое акционерное общество
«Белорусско-швейцарский банк «БСБ Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | на 01 октября 2020 г. | на 01 января 2020 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 33 034 | 23 460 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 19 969 | 19 901 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 36 902 | 57 275 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 83 857 | 102 697 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 108 645 | 68 433 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 21 453 | 22 190 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 0 | 1 234 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 35 | 35 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 28 522 | 29 134 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 1 970 | 1 392 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 8 208 | 6 392 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | | 342 595 | 332 143 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 4 | 12 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 277 188 | 271 810 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 1 070 | 10 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | 1 | 1 |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 7 802 | 5 118 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 286 065 | 276 951 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 22 900 | 19 678 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 7 492 | 6 969 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 19 024 | 19 443 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 7 114 | 9 102 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 56 530 | 55 192 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 342 595 | 332 143 |

### ОТЧЕТ
**о прибылях и убытках**
на 1 октября 2020 года

Закрытое акционерное общество
«Белорусско-швейцарский банк «БСБ Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | на 01 октября 2020 г. | на 01 октября 2019 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 8 276 | 7 252 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 1 263 | 1 061 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 7 013 | 6 191 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 18 319 | 17 262 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 8 636 | 5 840 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 9 683 | 11 422 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 80 | 130 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 28 | (178) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 16 067 | 9 595 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (2 590) | 482 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 641 | 389 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 1 133 | 654 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 21 220 | 19 301 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 757 | 573 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 8 796 | 8 033 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 1 412 | 1 599 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 7 384 | 6 434 |

Председатель Правления Дубков С. В.

Главный бухгалтер Бельник А. Н.

Дата подписания: 12 октября 2020 г.

УНП 807000069.

## О реализации дебиторской задолженности ЧТПУП «Травира»

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | **Управляющий по делу о банкротстве ЧТПУП «Травира» – ИП Угольник Дмитрий Геннадьевич: 220136, г. Минск, а/я 194, тел. +37529 6363522** |
| **Продавец** | **ЧТПУП «Травира»: 223017, Минская обл., Минский р-н, аг. Гатово, ОАО «Черметремонт», здание цеха ширпотреба, УНП 691389533** |
| **Форма, дата, время и место проведения торгов** | Торги в форме открытого аукциона **28.10.2020 в 10.00** в помещении экономического суда Минской области: г. Минск, ул. Жилуновича, 15 |
| **Сведения о предмете торгов, начальная цена предмета торгов** | Дебиторская задолженность<br>Лот № 1: УП «Агрокомбинат Ждановичи» на сумму 1711,46 рубля.<br>Лот № 2: ОАО «Бельковщина» на сумму 3704,06 рубля.<br>Лот № 3: ОАО «Бешенковичи агроервис» на сумму 313,49 рубля.<br>Лот № 4: ОАО «Глубокский комбикормовый завод» на сумму 557,73 рубля.<br>Лот № 6: ОАО «Забудова Агро» на сумму 4176,24 рубля.<br>Лот № 7: ОАО «Лапичи» на сумму 13739,34 рубля.<br>Лот № 8: ОАО «Лазовичи» на сумму 735,84 рубля.<br>Лот № 9: СПК «Любищицы» на сумму 4831,43 рубля.<br>Лот № 10: ОАО «Могилевхлебопродукт» на сумму 2998,00 рубля.<br>Лот № 11: КСУП «Племзавод «Ленино» на сумму 1027,84 рубля.<br>Лот № 12: ОАО «Речицкий комбинат хлебопродуктов» на сумму 1285,51 рубля.<br>Лот № 13: ОАО «Рита» на сумму 2227,76 рубля.<br>Лот № 14: ОАО «Строительно-монтажный трест № 19» на сумму 18835,91 рубля.<br>Лот № 15: ОАО «Чемерисский» на сумму 6254,33 рубля.<br>Лот № 16: ОАО «Экспериментальная база Чериков» на сумму 2278,70 рубля.<br>Лот № 17: ОАО «Западный Агро» на сумму 7497,13 рубля.<br>Лот № 18: ОАО Гомельоблстрой» на сумму 4272,49 рублей.<br>Лот № 19: КСУП «Песковцы» на сумму 2074,75 рубля.<br>Лот № 20: КСУП «Субботники» на сумму 574,66 рубля.<br>С более подробной информацией о порядке, условиях проведения торгов, предмете торгов и стоимости имущества можно ознакомиться в рабочие дни с 09.00 до 18.00 по тел. +37529 6363522 |
| **Порядок проведения торгов** | Шаг аукциона – 5 %.<br>Победителем торгов признается участник, предложивший наибольшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день их проведения. Договор купли-продажи предмета торгов должен быть подписан победителем в течение 5 рабочих дней с даты подписания протокола о проведении торгов. В случае признания торгов несостоявшимися возможна продажа предмета аукциона единственному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 % |
| **Размер задатка для участия в торгах** | Задаток в размере 10 % от начальной цены предмета торгов перечисляется на р/с ЧТПУП «Травира» № BY12 ZEPT 3012 0005 3001 9933 0000 в ЗАО «Цептер Банк», г. Минск, код ZEPTBY2X |
| **Порядок приема заявок на участие в торгах** | Заявки на участие в торгах принимаются **с 13.10.2020 до 17.00 26.10.2020.**<br>Заявки на участие в торгах с приложением док-тов (заверенный банком док-т о внесении суммы задатка, копия свид-ва о регистрации для ИП и юр. лица; копия паспорта для физ. лица и ИП) направляются заказной корреспонденцией в адрес управляющего, а также на e-mail: ugolnikd@rambler.ru |
| **Возмещение затрат** | Затраты на организацию и проведение торгов возмещаются победителем торгов |

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by** |
| **Продавец** | **ОАО «БЕЛВТОРРЕСУРСЫ», г. Минск, ул. Казинца, дом 2, кабинет 21, 220099** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов – недвижимое имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Загородная, 4**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Арочный склад** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 933,2 кв. м | 122/С-12457 |
| **Павильон-магазин** (здание специализированное организаций оптовой торговли, материально-технического снабжения и сбыта продукции). Составные части и принадлежности: уборная деревянная, две кабельные линии ВЛ-0,4 кв., забор металлический, колодец, колодец с пожарным гидрантом, покрытие из железобетонных плит | 352,6 кв. м | 122/С-12455 |
| **Склад ГСМ** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 14,1 кв. м | 122/С-12458 |
| **Склад твердого топлива** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 10,5 кв. м | 122/С-12456 |
| **Домик для сторожа** (здание нежилое). Составные части и принадлежности: холодная пристройка | 13,7 кв. м | 122/С-12454 |

**Сведения о земельном участке**: предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 0,6435 га для обслуживания филиала оптовой торговли

**Начальная цена с НДС 20 % – 243 417,60 бел. руб.** (снижена на 20 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать)** рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 1,5 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

**Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 20.08.2020**

**Дата и время начала и окончания электронных торгов:**
Начало торгов: 10.00 **28.10.2020.** Окончание торгов: 12.00 **28.10.2020.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **26.10.2020** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

## Извещение о проведении 17 ноября 2020 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Банк Дабрабыт»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | |
|---|---|---|
| **Наименование, местонахождение и характеристики продаваемого имущества** | **Начальная цена, бел. руб. (с учетом НДС)** | **Размер задатка, бел. руб.** |
| Изолированное помещение с инвентарным номером в ЕГРНИ 500/D-628167, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Стадионная, 14-4, общая площадь – 545,0 кв. м, назначение – помещение многофункциональное, наименование – гараж-стоянка на 9 автомобилей со вспомогательными помещениями, СТО и ФОКом в блоке с гаражами ГСК «Милавица» | 871 200,00 | 80 000,00 |

**Продавец имущества:** ОАО «Банк Дабрабыт», ул. Коммунистическая, 49, пом. 1, 220002, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов**:

1. победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов;

2. расходы, связанные с государственной регистрацией договора купли-продажи и основанных на нем прав, оплачиваются победителем торгов (покупателем).

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Банк Дабрабыт», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие с организатором торгов соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в срок не более 20 рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи.

Торги проводятся **17 ноября 2020 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 13.10.2020 по 13.11.2020 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**

(017) 365 48 36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 239-19-26 (ОАО «Банк Дабрабыт»).

Дополнительная информация размещена на официальном сайте организатора торгов – **www.mgcn.by**

# «Тэатры перасталі нас здзіўляць»

## Журналіст Валянцін ПЕПЛЯЕЎ прадставіў дэбютную п'есу «Нобелеўскі тыдзень»

**Новы драматычны тэатр запрашае гледачоў на паказ спектакля «Нобелеўскі тыдзень». Прэм'ера адбылася 2 і 3 кастрычніка. Камедыя ў іранічнай і парадаксальнай форме распавядае пра тое, як незаўважна для саміх сябе мы здраджваем ідэалам юнацтва і сваім былым марам. Як нас уцягвае ў вір чужой волі і чужых меркаванняў. Як незаўважна для саміх сябе замест падтрымання жывой натуральнай гаворкі мы раптам пераходзім на мову штампаў і стэрэатыпаў мас-медыя і сацыяльных сетак. Як з цягам часу ў нас прарастае зайздрасць да чужога поспеху, лянота і бяздзейнасць. «Нобелеўскі тыдзень» — гэта тэатральны дэбют журналіста Валянціна Пепляева. «Звязда» паразмаўляла з аўтарам і даведалася аб тым, як праходзіла работа над п'есай.**



***— Чаму тэатральны крытык вырашыў напісаць п'есу?***

— Напэўна, у нейкі момант кожны творчы чалавек адчувае маральнае стамленне ад таго, чым займаецца. Узнікае адчуванне «самапаўтору», вычарпанасці свайго рамяства. Таму хочацца паспрабаваць сябе ў іншай якасці. Гэта з аднаго боку. З другога — мне здаецца, што тэатральная крытыка і не толькі ў Беларусі, а і на ўсёй еўрапейскай прасторы перастае сур'ёзна ўплываць на тэатральны і культурны працэс, а існуе збольшага па інерцыі. Тэатры ствараюць ужо не спектаклі, а «праекты». «Праектнаму тэатру» крытыка не патрэбна. Тэатрам важна проста запоўніць зал. Замест крытыкаў прыйшлі навінавая тэатральная журналістыка, блогеры, піяр-падзеі. Вялікае значэнне мае сёння ацэнка «праекта» гледачамі ў форме «сарафаннага радыё». Трэці момант — неяк мне падалося, што і самі тэатры перасталі нас здзіўляць па-сапраўднаму. Усе ведаюць, на што здольны той ці іншы пастаноўшчык, тая ці іншая трупа, якая ў яе «столь». Шчыра кажучы, прарываў і адкрыццяў за апошнія гады не здаралася. Рэгулярна і сістэмна шукаць агрэхі ў чужых пасрэдных спектаклях — даволі надакучлівы занятак. Да таго ж, многія беларускія рэжысёры канструктыўную крытыку па-ранейшаму ўспрымаюць дрэнна.

***— Ці з'яўлялася адчуванне падчас напісання п'есы, што журналіст пераважае над аўтарам?***

— Наадварот, з'яўлялася пачуццё, што журналіст дапамагае аўтару ў творчым працэсе сваімі назіраннямі і ацэнкамі. Я думаю, без журналісцкай практыкі такі забыты жанр, як «сатырычная камедыя», у якім п'еса лёгкадумна заяўлена, ажывіць было б немагчыма.

***— Калі з'явілася ідэя «Нобелеўскага тыдня»?***

— Ідэя п'есы з'явілася ў 2015 годзе. Напісана яна была пазней, на працягу двух гадоў, — з 2016 па 2018 год. Мне сапраўды захацелася выказацца на паперы, менавіта ў форме, якая прадугледжвае пэўную долю эксцэнтрычнасці і гратэску. А таксама я імкнуўся да большай творчай свабоды, чым дазваляе крытычны артыкул. Умовы тут дыктуеш толькі ты сам.

***— Што падалося вам найбольш складаным падчас работы?***

— Самае складанае, як заўсёды, адно: стварыць адчуванне сапраўднасці фантасмагарычных падзей, якія адбываюцца. Напоўніць характары дзеючых асоб жыццём. Паколькі гэтая камедыя на мяжы фарсу, а часам і па-за мяжой, то важна было сачыць за адчуваннем камічнага, каб яно ўсё ж такі не знікала. Мне здаецца, у камедыі лепш перабраць, чым недарабіць... Самае непрыемнае, што можа з табой адбыцца — тое, што спектакль, заяўлены як камедыя, пройдзе ў цішыні. У моманты крызісу натхняўся фільмам Дзмітрыя Астрахана «Ты ў мяне адна», п'есай Фрыдрыха Дзюрэнмата «Візіт старой дамы» і «Іванам Васілевічам» Міхаіла Булгакава. У гэтых творах можна знайсці пэўныя іранічныя паралелі з сюжэтам п'есы.

***— Ці ёсць у вас тут любімы персанаж?***

— Няма. Усе дзеючыя асобы па-свойму дарагія аўтару, але адносіны з імі трэба спыняць, як толькі пастаўлена кропка. Хай зараз з імі спрабуюць пасябраваць акцёры.

***— У чым актуальнасць «Нобелеўскага тыдня»?***

— Гэта саманадзейная спроба паразмаўляць аб сённяшнім дні. Задумацца, што з намі адбываецца. Ці існуе праслаўлены дыялог інтэлігенцыі і грамадства... Нягледзячы на тое, што п'еса напісана на рускай мове, гэта, на маю думку, вельмі беларуская гісторыя. Ці будзе яна гучаць актуальна? Спадзяюся. Але ўсё ж такі драматургія — гэта не публіцыстыка, у яе больш шырокія задачы. З-за пандэміі прэм'ера была перанесена з сакавіка на кастрычнік. Рэпетыцыйны перыяд праходзіў, наколькі я ведаю, няпроста. Тэатр адчыніўся прэм'ерай пасля вялікага перапынку.

***— Ці знайшлі вы паразуменне з рэжысёрам-пастаноўшчыкам Сяргеем Кулікоўскім?***

— Як казаў драматург Эдуард Радзінскі, аўтар піша адну п'есу, рэжысёр ставіць другую, глядач сузірае трэцюю. П'еса пісалася з разлікам на трупу таленавітага і амбіцыйнага Новага драматычнага тэатра. На першых чытках уліčваліся заўвагі рэжысёра, за спектаклямі якога сачыў. Паразуменне, на мой погляд, было знойдзена лёгка. Кулікоўскі знакаміты сваімі яркімі спектаклямі як па сучасных аўтарах, так і па класіцы. Ён нястомны і прагны да працы. Кожны раз ляціць на свята рампы, як матылёк. Мне здаецца, ён у поўнай меры мог бы падпісацца пад словамі рэжысёра Анатоля Эфраса: «Рэпетыцыя — любоў мая...»

***— Што вы адчуваеце перад прэм'ерай сваёй дэбютнай работы?***

— Не хочацца казаць нейкія банальнасці пра хваляванне. Але яно, безумоўна, ёсць, як і адчуванне няёмкасці ад таго, што паважаныя дарослыя людзі будуць вымушаны прамаўляць нейкія твае словы са сцэны. Перачытваючы тэкст, бачыш, што можна было напісаць больш дакладна, больш смешна... Хочацца ўсклікнуць, як персанаж Мікалая Пастухова са стужкі «Раба кахання»: «Я ўсё геніяльна перапішу!..» Але ўжо позна. Мне цікава, як будзе гучаць тэкст, як будзе рэагаваць зала. Бо ў апошні час усе мы перажылі пэўную пераацэнку каштоўнасцяў з-за пандэміі, яна паставіла пад пытанне само існаванне тэатра і інтэлектуальных прафесій. І кропка ў гэтым пытанні яшчэ не пастаўлена.

***— Валянцін, вы плануеце заставацца ў драматургіі?***

— Загадваць не будзем, але другая п'еса амаль скончана. Засталіся некаторыя штрыхі. Мне не блізкая дакументальная драма, якая зараз запатрабавана тэатрамі. Лічу, што вербацім — гэта тупік. Не люблю новую драму і ўсе падробкі пад яе, адкрытую чарнуху. Мне цікава займацца гульнявым сюжэтным тэатрам, карнавалізацыяй і сінтэзам жанраў. Камусьці гэта можа падацца старамодным. Таму пытанне стаіць інакш: ці пакінуць цябе ў драматургіі — час, фармат, мода, густы рэжысёраў і публікі.

**Арына КАРПОВІЧ.**

Фестываль

# Конкурс нацыянальных кінашкол «Лістапада» — па новых правілах

**Сёлета ўсе праходзяць сур'ёзнае выпрабаванне на прафесіяналізм і ўменне прызвычайвацца да непрадказальнасці жыцця. Эпідэмія каранавіруса адбілася сур'ёзна і на кінаіндустрыі, бо спыніла здымкі многіх праектаў, адмяніла або перанесла многія прэм'еры і фестывалі (некаторыя, праўда, перайшлі ў анлайн), закрыла кінатэатры і прыпыніла вучобу ў кінашколах. І якраз уменне знайсці ў такіх абставінах рэсурс для развіцця і выжывання дало кінаіндустрыі новыя фарматы, падыходы да творчасці і камунікацыі паміж творцамі і іх гледачамі.**

Арганізатары Міжнароднага мінскага кінафестывалю «Лістапад» таксама не засталіся ўбаку. Паколькі гэтае мерапрыемства ставіць сваёй галоўнай задачай фіксаваць самыя свежыя праявы жыцця кіно, то тут увялі новыя правілы конкурсу нацыянальных кінашкол. Сёлета ўдзельнікі выпрабуюць сябе не толькі ў творчасці, але і ў якасці экспертаў — у ролі журы і канкурсантаў адначасова. Калі такі эксперымент прадэманструе, што галоўныя каштоўнасці прафесійнай супольнасці — сумленнасць і салідарнасць, таварыскасць і супрацоўніцтва — падтрымліваюць усе яго ўдзельнікі, студэнты кінашкол розных краін свету, то такія правілы застануцца і ў будучыні.

У 2020 годзе разам з рэгулярным міжнародным журы кінематаграфістаў падчас конкурсу нацыянальных кінашкол упершыню працуе міжнароднае студэнцкае журы, калегіяльны орган, які складаецца з удзельнікаў конкурсу.

Міжнароднае журы кінематаграфістаў ацэньвае конкурсныя фільмы і калегіяльным рашэннем прысуджае прыз «За найлепшы фільм», а таксама мае права адзначыць дыпломамі фільмы, вартыя, на іх погляд, адмысловага згадвання. Міжнароднае студэнцкае журы ацэньвае конкурсныя фільмы і прысуджае свой прыз «За найлепшы фільм» (лаўрэат гэтага прыза вызначаецца па выніках адкрытага прамога тайнага галасавання ўдзельнікаў конкурсу).

Кожнаму ўдзельніку, які прадстаўляе здымачную групу конкурснага фільма, прысвойваецца нумар, пад якім яго голас будзе зафіксаваны і ўлічаны. Свой голас удзельнікі маюць права аддаць той конкурснай кінастужцы, якая, на іх думку, вартая перамогі ў намінацыі «За найлепшы фільм». Аднак адна кінастужка можа быць прадстаўлена ў галасаванні толькі адным удзельнікам. То-бок, колькасць галасоў раўняецца колькасці конкурсных фільмаў.

Калі конкурсны фільм прадстаўляюць некалькі ўдзельнікаў здымачнай групы, то яны павінны вызначыць, хто з іх будзе галасаваць. Таксама будзе магчымасць прыняць калегіяльнае рашэнне, якое агучыць іх прадстаўнік з дапамогай аднаго голасу. Разам з тым удзельнік не можа галасаваць за свой фільм.

Напярэдадні галасавання адбудуцца дэбаты ўдзельнікаў, дзе кожны зможа аргументаваць сваю пазіцыю і заклікаць да галасавання за свой фільм. Але за парушэнні этычных нормаў, заканадаўства і рэгламенту фестывалю ўдзельнік можа быць пазбаўлены голасу.

Галасаванне пройдзе ў канцы апошняга конкурснага дня (пасля прагляду і абмеркавання ўсіх фільмаў конкурснай праграмы). Яно праводзіцца анлайн (для тых, хто не змог прыехаць на фестываль) і афлайн, праз запаўненне электронных формаў і папяровых бланкаў, якія захоўваюцца і пратакалююцца. У выпадку, калі некалькі фільмаў набіраюць аднолькавую колькасць галасоў, то пераможцу вызначаць у выніку паўторнага адкрытага прамога галасавання. Вынікі падводзяцца на цырымоніі ўзнагароджання, якая трансліюецца анлайн. Па рашэнні міжнароднага журы кінематаграфістаў і міжнароднага студэнцкага журы будуць уручацца два прызы «За найлепшы фільм». Больш падрабязна з новымі правіламі конкурсу можна азнаёміцца на сайце фестывалю.

**Алена ДРАПКО.**

Спецыяльна для «Звязды»

# КАЛІ КОШКІ ТАНЦУЮЦЬ БАЛЕТ...

## значыць, іх гаспадар — Юрый Куклачоў

**Вядомы на ўвесь свет, адзіны на планеце дрэсіроўшчык кошак, народны артыст РСФСР Юрый Куклачоў на гэтым тыдні парадаваў жыхароў Віцебшчыны і Магілёўшчыны выступленнямі свайго тэатра. Віцебскі карэспандэнт «Звязды» меў гонар не толькі пабываць на ўнікальным шоу, але і ўзяць эксклюзіўнае інтэрв'ю пасля канцэртнай праграмы. Гутарылі не толькі пра кошак. Было прыемна пачуць з вуснаў такога чалавека словы павагі і любові да Беларусі. Суразмоўнік развесяліў расказамі пра чатырохлапых, якія лепш за ўсіх экспертаў высока ацанілі якасць беларускіх прадуктаў. А, дарэчы, што ім лепш прапаноўваць паесці?.. Цікавая размова зацягнулася да позняга вечара.**



### Талент ад Бога мае кожны

У Віцебскай абласной філармоніі ўбачыў натоўп дарослых і дзяцей ў фае. Чарга да... Аказваецца легендарны кошчын клоўн з празрыстым «экранам» на твары раздаваў аўтографы і з задавальненнем фатаграфаваўся.

> **У Вялікабрытанію яго пускалі, а хвастатых артыстаў — не. Дык ён налавіў мясцовых кошак і праз тры месяцы зрабіў з імі цудоўную праграму...**

Ды размаўляў з кожным, як сваяк: з цеплынёй у вачах і голасе, быццам дзядуля, не дзеля «пабыць з публікай»... У свае 71 год выглядае ён на сто... Канешне, я не пра век, а на стольнік працэнтаў добра!

Убачыўшы, што я з фотакамерай (як толькі паспеў?), даведаўся як мяне завуць і прасіў вельмі ветліва, каб не здымаў з фотаўспышкай. А лепш наогул. Растлумачыў, што, убачыўшы мяне, астатнія пачнуць рабіць фота, а яго хвастатым партнёрам, мякка кажучы, не падабаецца такая ўвага.

Шоу ў дзве дзеі з перапынкам глядзелася на адным дыханні. Гэта не проста выхад на сцэну і паказ трукаў. Гэта спектакль, вельмі яскрава афармлены, казка з вялікай літары.

Кошкі і сабакі паказвалі на сцэне «звычайныя цуды»: скакалі, куды трэба, рабілі, што загадвалі. Адразу, адчувалася, што яны вельмі любяць свайго партнёра. Фурор выклікаў знакаміты цыркавы нумар «Кот і кухар», калі хвастатая ну ніяк не хоча пакідаць рондаль.

А яшчэ артыст жангліраваў, як кажуць прафесіяналы, працаваў з глядзельнай залай, энергія яго зараджала.

У канцы канцэртнай праграмы Куклачоў па-бацькоўску звярнуўся да дзятвы. Сказаў, што кожны з іх мае талент ад Бога і трэба яго адчуць, развіваць, што неабходна, калі пра нешта марыш, дабівацца сваёй мэты. Ён, між іншым, сем разоў паступаў у цыркавое вучылішча! Упэўнена расказваў і пра моц дабрыні. Ад шчырасці яго слоў, прызнаюся, асабіста ў мяне вочы сталі вільготныя.

### Кошкі любяць... беларускае!

У Вікіпедыі напісана, што суразмоўнік нарадзіўся 12 красавіка 1949 года ў Хімкінскім раёне, а ў некаторых іншых інтэрнэт-крыніцах, што ў Маскве.



Дзеці — заўсёды самыя ўдзячныя гледачы.

Пры размове Юрый Дзмітрыевіч растлумачыў, што ён усё ж масквіч. Бацька-інжынер расказаў анекдот пра Сталіна, а здарылася гэта, як потым высветлілася, за некалькі дзён да смерці «бацькі ўсіх народаў».

> **«Паедзем з раніцы ў краму, накупім вашай смакаты. Прывязём дадому — і ў халадзільнік. І будзем жыць месяц, як быццам у Беларусі!»**

«Жартаўніка пад хатні арышт. І, канешне, была вялікая верагоднасць, што рэпрэсіі будуць у дачыненні яго жонкі, іншых членаў сям'і. Таму дзядзька нас у вёску звёз. І там я жыў да сямі гадоў у бабулі. Гектар зямлі ў яе, які суседзі дапамагалі ўзараць. Агурочкі і бульбачка свае. І куры, і каза была *(смяецца)*. А сусед прынясе сала, калі свінню зарэжа, карова ў людзей, малаком і маслам пачастуюць. Памятаю, яблыкі сушылі. Толькі і куплялі, што муку, запалкі, соль», — згадвае артыст сваё дзяцінства.

Разважаючы пра якасць сучасных прадуктаў, Куклачоў не шкадаваў кампліментаў на адрас беларускіх вытворцаў.

«Мы тут аб'ядаемся!!! Вэнджаную каўбасу курыную ўпершыню ў жыцці пакаштаваў тут! Вау! Ммммммм. Я і не ведаў што такое наогул можа быць! — расказваў ён вельмі эмацыянальна і з вялікай асалодай. — Раніцай сёння еў курыцу без пеніцыліну і свініну! А памідоры на днях прынеслі, такія смачныя, забыўся, калі еў такія! Турэцкія есці немагчыма. Паедзем з раніцы ў краму, накупім вашай смакаты. Прывязём дадому — і ў халадзільнік. І будзем жыць месяц, як быццам у Беларусі!»

Між іншым... Каго не падманеш, дык гэта жывёл наконт якасці харчавання. Юрый Дзмітрыевіч расказаў, што яго выхаванцы ахвотна ядуць беларускія мясныя вырабы, а вось у Маскве, бывае, і не прымусіць.

### Сямейная справа

Паважаны Майстар вельмі шмат расказваў пра гастролі. Згадаў факт, калі ў Вялікабрытанію яго пускалі, а хвастатых артыстаў — не. Дык ён налавіў мясцовых кошак і праз тры месяцы зрабіў з імі цудоўную праграму...

У Беларусі, ганарыцца артыст, яго вельмі паважаюць. Тут надрукаваныя яго кнігі з цыкла «Школа дабрыні» і іншыя... І гэта — філасофія і рэкамендацыя, як вырасціць гарманічную асобу, як ужо дарослым не страціць інтарэс да жыцця. Між іншым, менавіта беларусы даўно пачалі вырабляць ляльку — «копію Куклачова».



Сфатаграфаваўшыся з нашым карэспандэнтам, артыст пабег даганяць жонку.

Юрый Дзмітрыевіч — ганаровы прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Ён падзяліўся планамі адкрыцця філіяла свайго тэатра ў Мінску, тым больш што ад Масквы зусім недалёка. Яго дзеці, якія працягваюць бацькаву справу, маглі б дзяліцца сакрэтамі майстэрства, выступаць на навагодніх шоу.

Дзеці сапраўды пайшлі па шляху бацькі. Старэйшы сын Дзмітрый каля дзесяці гадоў таму стаў заслужаным артыстам Расійскай Федэрацыі. Ён — артыст і першы намеснік мастацкага кіраўніка тэатра кошак. Жонка Дзмітрыя Марына таксама працуе ў калектыве. Дачка Кацярына — галоўны мастак, намеснік мастацкага кіраўніка па агульных пытаннях тэатра бацькі. Малодшы 37-гадовы сын Куклачова Уладзімір працаваў салістам у знакамітым балетным тэатры Панова ў Ізраілі. Пасля таго як скончыў кар'еру, пачаў таксама працаваць з хвастатымі. Ды як! Паставіў кацiны балет!

Іх зорны бацька ганарыцца, што ў спадчыну дзецям пакіне прафесію, якая дазволіць заўсёды зарабіць не толькі на кавалак хлеба.

У Віцебску зорны клоўн выступаў з жонкай Аленай Ісакаўнай. З ёй яны разам яшчэ з цыркавога вучылішча.

«У чым сакрэт шчаслівага сямейнага жыцця!? У тым, што трэба быць памяркоўнымі. Сям'я — адзінае, адно цэлае не трэба сябе вылучаць. Калі вось ты кахаеш жонку, каханне — гэта заўсёды жадаць здароўя і дабра. І яна табе жадае таго ж. І ўсё на ўзаемнасці. Жанчына павінна таксама разумнай быць...», — паразважаў на развітанне і пасля сумеснага фота пабег даганяць жонку, якая строга сказала перад гэтым, што хопіць размаўляць...

На памяць з Віцебска Юрый Куклачоў павязе і кубак ад «Звязды». Пажартаваў, што будзе з яго «чаі ганяць».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота з асабістага архіва аўтара і Юрыя КУКЛАЧОВА.**

# Шляхі-дарогі Караткевіча па планеце Зямля

**УСПРЫМАННЕ ўласнай нацыянальнай годнасці — гэта і пытанне параўнання: а як да нас ставяцца ў свеце. Гэта датычыцца і выяўленчага мастацтва. І тэатра, музыкі, кінематографа... Чамусьці для нас важна, што прызнаныя ў свеце Марк Шагал і Хаім Суцін нарадзіліся ў Беларусі. Мы з гонарам гаворым пра ўраджэнца Расіі Уладзіміра Мулявіна, які прадстаўляў на розных кантынентах беларускую песню. Гэта датычыцца і нацыянальнай літаратуры. Як характарыстыка прызнання, сусветнай увагі — пераклад верша народнага песняра Беларусі Янкі Купалы «А хто там ідзе?» болей як на 100 моў народаў свету.**
**Класіка беларускай нацыянальнай літаратуры, паэта, празаіка, драматурга, сцэнарыста, публіцыста, перакладчыка Уладзіміра Сямёнавіча КАРАТКЕВІЧА (1930—1984) няма сярод нас болей як трыццаць шэсць гадоў. За гэты час выйшаў Збор яго твораў у 8 тамах. Быў і дадатковы том праз некаторы час пасля завяршэння выдання. Дзякуючы руплівасці выдавецтва «Мастацкая літаратура» і слыннага літаратуразнаўца Анатоля Вераб'я зараз выходзіць Збор твораў класіка ў 25 тамах. За дзесяцігоддзі пасля смерці пісьменніка выйшлі дзясяткі асобных выданняў яго твораў. Толькі за апошняе дзесяцігоддзе — амаль пяцьдзясят... А наколькі вядомы Уладзімір Караткевіч у свеце? Адказ на гэтае пытанне мы шукаем разам з намеснікам генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі даследчыкам беларускай кнігі Аляксандрам СУШАМ.**

***— Ці відаць з Мінскага прастора Уладзіміра Караткевіча ў іншых краінах? Наколькі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ўлічаны пераклады твораў аўтара «Каласоў пад сярпом тваім» на іншыя мовы народаў свету?***

— Пытанне і простае, і няпростае. З аднаго боку, можна было б без асаблівых разваг адказаць на яго станоўча. Добра вядома, што творы Уладзіміра Караткевіча перакладзены на шматлікія мовы народаў свету: англійскую, балгарскую, венгерскую, в'етнамскую, грузінскую, іспанскую, латышскую, нямецкую, мангольскую, польскую, рускую, славацкую, украінскую, французскую, чувашскую, чэшскую, эстонскую і іншыя.

Усе гэтыя пераклады і іх выданні, хоць яны і рыхтаваліся для замежнага чытача, уяўляюць вялікую цікавасць для Беларусі як нашы нацыянальныя дакументы. Таму Нацыянальная бібліятэка Беларусі імкнецца адсочваць іх з'яўленне. Для гэтага выкарыстоўваюцца самыя розныя сродкі: нешта мы купляем, нешта атрымліваем у падарунак, нечым абменьваемся з замежнымі калегамі на ўмовах міжнароднага дакументаабмену. Сваю дапамогу аказваюць не толькі бібліятэкі замежжа, але і прадстаўнікі беларускай дыяспары, замежныя беларусазнаўцы (тут хацелася б падкрэсліць ролю Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў), выдаўцы, перакладчыкі, літаратуразнаўцы, дыпламатычныя прадстаўніцтвы нашай краіны за мяжой і іншыя зацікаўленыя асобы і ўстановы. Безумоўна, сваю карысць дае і выкарыстанне замежных бібліяграфічных баз даных, электронных каталогаў розных краін.

Хуткі пошук па электронным каталогу дазваляе ўпэўніцца, што ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі прадстаўлены пераклады твораў Уладзіміра Караткевіча на англійскую, балгарскую, венгерскую, латышскую, літоўскую, нямецкую, польскую, сербскую, славенскую, украінскую, французскую, чэшскую, эстонскую і іншыя мовы.

З іншага боку, «прастора Уладзіміра Караткевіча ў іншых краінах» відаць сёння іначай, чым тое было некалі. У нейкай ступені ствараецца адчуванне, што цікавасць да спадчыны Уладзіміра Караткевіча з боку замежных перакладчыкаў і выдаўцоў некалькі аслабла. На некаторых мовах яго творы не выдаваліся ўжо некалькі дзесяцігоддзяў.

***— Уладзімір Караткевіч, на ваш бібліяграфічны досвед, найбольш цікавіць славянскага чытача?..***

— Так, з гэтым у значнай меры трэба пагадзіцца. І падобная сітуацыя аб'ектыўная. Цалкам натуральна, што айчынная літаратура найбольш цікавая і вядомая для нашых суседзяў, а яны, у пераважнай большасці — славяне.

Пры гэтым трэба прызнаць, што пераклады з'яўляюцца і на ўсходне-, і на заходне-, і на паўднёваславянскіх мовах. Пераклады гэтыя найчасцей створаны носьбітамі мовы, пісьменнікамі або перакладчыкамі з гэтых краін.

У прыватнасці, творы Караткевіча выдаваліся ў перакладах на балгарскую мову Хрыста Берберава (1968), Георгія Вылчава (1971), Сімяона Уладзімірава (1977, 1982), Румяна Яўцімава (1978, 1981), Пенка Кынева (1983), Андрэя Германава (2000), Найдзена Вылчава (2000) і іншых. З украінамоўнымі выданнямі працавалі Алена Лук'янчук і Карпо Скрыпчанка (1972, 1982).

Здаралася, што творы Уладзіміра Караткевіча ў тых ці іншых аўтарскіх перакладах выдаваліся і перавыдаваліся неаднаразова. Напрыклад, па-польску ў перакладзе Яна Гушчы яны выходзілі з зайздроснай перыядычнасцю — у 1971, 1974 і 1976 гадах.

Часам гэтыя пераклады рабілі і беларусы, якія добра валодалі той ці іншай славянскай мовай. Так, напрыклад, добра вядомыя пераклады паэзіі Уладзіміра Караткевіча на сербскую мову ў выкананні вядомага айчыннага літаратуразнаўца, сербіста Івана Чароты, які так высока ацэнены ў Сербіі, што ўганараваны званнем акадэміка Сербскай акадэміі навук.

І ўсё ж, трэба прызнаць, што найбольшая колькасць перакладаў твораў Уладзіміра Караткевіча выйшла ў Расіі...

***— Дарэчы, як вы лічыце, ці дастаткова ўсё ж такі перастварэнняў прозы і паэзіі Уладзіміра Сямёнавіча на рускую мову?***

— На рускую мову былі перакладзены і выдадзены вядомыя творы Караткевіча, якія выйшлі асобным выданнем, а таксама творы ў складзе зборнікаў і часопісаў. Сярод іх аповесці «Дикая охота короля Стаха», «Седая легенда», «Ладья Отчаяния», раманы «Колосья под серпом твоим», «Черный замок Ольшанский», «Христос приземлился в Гродне», празаічная паэма «Чозения» і многія іншыя.

Здавалася б, нямала. Некаторыя творы перакладаліся нават неаднойчы. Аднак, па-першае, трэба прызнаць, што частка гэтых перакладаў зроблена не для расійскага кніжнага рынку, а для айчыннага: на жаль, нямала беларусаў аддае перавагу чытанню класічных твораў беларускай літаратуры ў перакладзе.

Па-другое, трэба прызнаць, што наяўнасць перакладаў на рускую мову яшчэ не азначае іх шырокую даступнасць і папулярнасць. Так, іх вялікая доля была выканана яшчэ ў мінулыя дзесяцігоддзі і сёння мала даступная для пакупнікоў у кнігарнях. Тым больш, калі гаварыць пра пакупніка кнігі, пра чытача Расіі.

Але самае важнае нават не гэта ўсё. Сёння, як мне падаецца, ужо прайшоў той час, калі галоўным сродкам фарміравання попыту было стварэнне прапановы. Я маю на ўвазе, што не столькі перавыданнем твораў пісьменніка фарміруецца цікавасць да яго творчасці, колькі наадварот: узрастанне цікавасці да яго творчасці павінна стымуляваць выдаўцоў друкаваць чарговае выданне яго прац. І ў гэтым ключы правільна было б казаць пра мэтанакіраваную дзейнасць дзяржавы і грамадскіх інстытутаў па папулярызацыі нацыянальнай літаратуры. Патрэбна агульнадзяржаўная праграма ў гэтым кірунку.

***— Ці не падаецца вам, што маштаб Уладзіміра Караткевіча да канца не зразумелы ў Расіі і нават на Украіне з-за адсутнасці вартасных перакладаў?***

— У пэўнай меры гэта сапраўды так. Калі б у рускамоўным асяроддзі існаваў дастаткова адчувальны попыт на пераклад твораў Уладзіміра Караткевіча, то з'явіліся б і замовы на пераклад на конкурснай аснове, і мэтавыя звароты да Існуюць фонды і гранты для падтрымкі і папулярызацыі нацыянальнай літаратуры за мяжой. Яны атрымліваюць і пераразмяркоўваюць фінансаванне на пераклады твораў айчынных пісьменнікаў на замежныя мовы, наладжваюць конкурсы перакладаў, арганізуюць прэзентацыі за мяжой, дамаўляюцца з замежнымі ўстановамі культуры аб набыцці гэтых кніг, прадстаўляюць нацыянальную літаратуру на міжнародных кніжных і літаратурных форумах і кірмашах... І гэта толькі адзін прыклад таго, як адбываецца папулярызацыя нацыянальнай літаратуры для замежнай аўдыторыі. Шмат робіць Германія для прасоўвання сваёй літаратуры, напрыклад, творчасці Гётэ, Італія — Дантэ, Польшча — Адама Міцкевіча (таго самага ўраджэнца Беларусі), Украіна — Тараса Шаўчэнкі і г. д. Пра Расію нават і казаць не варта, бо яна здолела стварыць папулярызацыю, то якое ў нас можа быць маральнае права скардзіцца на яе няведанне жыхарамі іншых краін?

***— «Каласы пад сярпом тваім» — даволі складаны мастацкі твор, у ім некалькі пластоў, сапраўдная глыбіннасць, якая патрабуе і ведання беларускай гісторыі, можна сказаць, падрыхтоўкі чытача, некаторай яго гістарычнай адукаванасці. Вы перакананы ў тым, што маштаб гэтага рамана да канца зразумелы чытачу Расіі, Украіны ці краін Балтыі?***

— Часткова трэба пагадзіцца з гэтым меркаваннем, але і не зусім. Твор сапраўды шматпланавы, заснаваны на багатым гістарычным фактажы. Аднак з майго досведу магу сказаць, што ён абсалютна лёгка чытаецца і людзьмі, зусім слаба знаёмымі з гісторыяй Беларусі. Урэшце неяк жа мы ўсе здольныя чытаць творы



Фота Яны ХВЕДЧЫНЫ.

вядомых і таленавітых перакладчыкаў. Урэшце самі перакладчыкі змагаліся б за права працаваць з папулярным тэкстам.

Паўплываць на сітуацыю можна. Шмат у якіх краінах пры ўрадзе ці як самастойныя ўстановы існуюць Інстытуты кнігі, якія планамерна займаюцца вывучэннем попыту на нацыянальную літаратуру, выпрацоўваюць стратэгію па яе папулярызацыі і падтрымцы, фарміруюць метадычныя парады для гульцоў на інфармацыйным рынку. Яны працуюць на навуковай аснове, аналізуюць сусветную і нацыянальную статыстыку, наладжваюць праблемна арыентаваныя круглыя сталы, запрашаюць вядомых экспертаў, арганізуюць ці каардынуюць правядзенне прэзентацыйных і навуковых мерапрыемстваў за мяжой з мэтай папулярызацыі літаратуры іх краін або творчасці тых ці іншых нацыянальных аўтараў.

магутнейшую праграму папулярызацыі сваёй літаратуры і яе прадстаўнікоў за мяжой. І з гэтай праграмай смела ідзе і ў краіны Еўропы, і краіны Азіі. Што казаць, калі ў Беларусі да зусім нядаўняга часу было менш помнікаў айчынным пісьменнікам, чым расійскім, калі імёнамі беларускіх творцаў было названа менш вуліц, праспектаў, бібліятэк і г. д., чым імёнамі аўтараў, безумоўна, вялікай і брацкай, але суседняй краіны. У нас колькасць адных толькі помнікаў Пушкіну перавышае колькасць помнікаў любому айчыннаму пісьменніку. Такога няма ні ў адной краіне свету. А колькі мы маем помнікаў Уладзіміру Караткевічу? Думаю, большасць беларусаў не прыгадае ніводнага.

Дык чаго пасля гэтага мы можам патрабаваць ад замежнікаў? Калі мы самі недастаткова паважаем айчынную літаратуру і недастаткова клапоцімся пра іх Гамера, Шэкспіра ці Сервантэса. То чаму мы павінны так баяцца, што айчынную мастацкую літаратуру замежны чытач не здолее зразумець? Тым больш, калі мы кажам пра суседнія краіны. Вядома, што падзеі напярэдадні паўстання 1863—1864 гадоў, апісаныя ў «Каласах пад сярпом тваім», вельмі блізкія і добра вядомыя ў суседніх Літве і Польшчы, але і для расіян ды ўкраінцаў яны таксама збольшага зразумелыя і часта некалькі вядомыя. Думаю, што ў гэтым выпадку не варта перажываць, ці ўсе гістарычныя аспекты здолее зразумець замежны чытач (урэшце на рознай ступені глыбіні твор чытаюць і самі беларусы, што таксама нармальна). Так ці іначай, але мы маем справу не з навуковым творам, які павінен быць максімальна дакладны і зразумелы, а з творам мастацкім.

**Гутарыў Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Оператор ЭТП | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46 |
| Адрес ЭТП | www.ipmtorgi.by |
